№8 (366) 27 лютага 2004 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ Г

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Крамбамбуля

спэцыяльны нумар да канцэрту старонкі 8–10

Абмен ударамі

Прэс-сакратар прэзыдэнта Расеі Аляксей Громаў лічыць, што «спадарыня Пяткевіч моцна памыляецца», калі кажа, што рашэньне пра газавую блякаду прымаў асабіста Пуцін. Маўляў, гэта спрэчка «на ўзроўні гаспадарчых суб'ектаў, а хто марозіць беларускі народ, відаць, і так ясна».

Кіно пра Быкава

Менская кінастудыя «Тацяна» зьняла дакумэнтальны фільм пра Васіля Быкава (аўтар сцэнару — Ірына Пісьменная, рэжысэр — Мікалай Дзінаў). У фільме выступаюць сябры пісьменьніка Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Уладзімер Мехаў ды інш.

Зьезд фэрмэраў

27—28 лютага ў Менску пройдзе IX зьезд фэрмэраў. Цяпер у краіне 2,5 тыс. фэрмэрскіх гаспадарак. У іх руках — 150 тыс. га. 21 фэрмэра «нагрузілі» стратнымі калгасамі. Летась яны вырасьцілі 9,6% бульбы і 16,4% усёй гародніны.

Бел-чырвона-белы над Менскам

Бел-чырвона-белы штандар быў вывешаны «зубрамі» на дроце, на вышыні 20-павярховага дому, у Сухараве 23 лютага.

Студэнты за аднаўленьне

Студэнты гістфаку Берасьцейскага ўнівэрсытэту прапануюць аднавіць на тэрыторыі крэпасьці кляштары бэрнардынак і бэрнардынаў. Нагода — тысячагодзьдзе гораду ў 2019 г. Студэнты распрацавалі дэтальны плян аднаўленьня і падбілі рахунак. Старшыня гарвыканкаму Мікалай Гардзіевіч «ня ведае», як рэалізаваць ідэю, хоць і згодны: «Штосьці трэба зрабіць».

Яшчэ адзін вораг

Швэдзкага журналіста Тобіяса Люнгваля не пусьцілі ў Беларусь. Ён ехаў, каб быць сьведкам на судзе, зьвязаным з давыбарамі ў Белаазерскі гарсавет. У аэрапорце «Менск-2» яму без тлумачэньня прычынаў забаранілі ўяжджаць на тэрыторыю краіны і адправілі назад у Вену. Сп.Люнгваль — аўтар кнігі пра Беларусь, ён наведваў яе 18 разоў.

СМ; БелаПАН

PHOTO.BY/MEDIA.NET

Старонка 4

Не кажы ВУП

Тыдзень без чужога слова

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень. Дык падпісвайся!

Газэта была заснаваная ў 1906 годзе, адноўленая ў 1991 годзе. Пасьля аднаўленьня выходзіць ужо 13 гадоў.

Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Адкрытая падпіска на другі квартал.

Беларуска–расейскі газавы канфлікт

Пасьля кароткачасовага спыненьня падачы газу 18—19 лютага беларускія і расейскія афіцыйныя асобы працягваюць абменьвацца крытычнымі заявамі. У Маскве доўжацца перамовы паміж прадстаўнікамі беларускага ўраду і «Белтрансгазу». Для «НН» падзеі камэнтуюць дэпутат палаты прадстаўнікоў **Уладзімер Ягораў,** эканаміст **Валер Дашкевіч,** палітолягі **Валер Булгакаў** і **Вітаўт Сіліцкі,** пісьменьнік **Іван Шамякін,** прафэсар **Адам Мальдзіс** ды іншыя. З Баранавічаў паведамляюць: «Усе клялі расейцаў і хвалілі Лукашэнку». З Горадні: «Калі б не аднавіліся пастаўкі газу, «Азот» спыніўся б 19-га ўначы».

Што, па сутнасьці, адбылося 19 лютага? Здаўся Лукашэнка ці ня здаўся, пагадзіўшыся на ўмовы Пуціна? Расея дасягнула таго, чаго дабівалася?

Валер Булгакаў, рэдактар часопісу «ARCHE»:

— Адбылася гістэрыка расейскага кіраўніцтва, выкліканая тым, што беларускі прэзыдэнт ня йдзе на стратэгічныя саступкі расейцам у полі апанаваньня бюджэтаўтваральных галінаў эканомікі Беларусі. Я б ня стаў зьвязваць гэтыя падзеі выключна з газавым канфліктам. Насамрэч тут адбылася нейкая вайна прынцыпаў. Ня маюць рацыі аглядальнікі «Белорусской газеты», якія патлумачылі сытуацыю параналдальным нежаданьнем Лукашэнкі саступіць «Газпрому» некалькі даляраў. Тут жа гаворка ідзе аб прынцыпах далейшага эканамічнага суіснаваньня. З аднаго боку, у кароткачасовай пэрспэктыве Лукашэнка, натуральна, здаўся. Зь іншага боку, стаўкі ў гэтай гульні значна не зьмяніліся, істотнага прарыву не адбылося, будучыня няясная. Лукашэнка даў загад сваім падначаленым падпісаць гэтую дамову, але яна дагэтуль не падпісаная. І няясна, што будзе ў ёй. Таму гаварыць пра нейкую «капітуляцыю» яўна заўчасна. Стратэгічная мэта расейцаў — дасягненьне кантролю над беларускай эканомікай пры дапамозе рынкавых інструмэнтаў. Менавіта гэтага не адбылося.

Валеры Дашкевіч, выканаўчы дырэктар ААТ «Белгазпрамбанк»:

— Лічыць, што Лукашэнка здаўся, ранавата. У яго яшчэ ёсьць рычагі ўзьдзеяньня на газавую праблему. Да гэтага дадаецца і незадаволенасьць нядаўняй сытуацыяй палякаў, літоўцаў. Галоўная мэта «Газпрому» — уключыць беларускі кавалак трубы ў сваю агульную сыстэму, якая ахоплівае вялікую частку Эўропы, даходзіць нават да Грэцыі... «Газпром» мусіць клапаціцца пра эфэктыўную і надзейную працу. Але пакуль труба знаходзіцца ў беларускай уласнасьці, ён ня можа ўкладаць у яе інвэстыцыі. Канфлікт далёка ня вычарпаны, чарговая яго актывізацыя можа адбыцца ў пачатку сакавіка і працягвацца да канца 2004 г.

Супрацоўнік Нямецкай Рады замежнай палітыкі **Аляксандар Рар** у інтэрвію радыё «Свабода»:

— У Лукашэнкі не было ніякіх іншых магчымасьцяў. Ён ня мог чакаць стратэгічнай абароны ані ад Нямеччыны, ані ад іншых краінаў, якія атрымліваюць газ. Таму ён быў вымушаны здацца. Ягоныя пазыцыі ў Эўразьвязе значна горшыя, чым расейскія.

Працяг на старонцы 3.

ТЫДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ

Газ газам, але гэта ня тая сфэра, дзе грамадзтва можа нешта вырашыць. Для Лукашэнкі газ — гэта важна. Пра яго кажуць «дагуляўся» або «малайчына» (**старонка 3**). Не для Беларусі. Беларусь рана ці позна апынецца ў сытуацыі без Лукашэнкі. Як і калі гэта будзе — вось што важна для грамадзтва, бо ад яго залежыць. У гэтай справе факт, што «Свабодная Беларусь» у Вільні дамовілася зь «Пяцёркай» (**гл. ніжэй**) ня шкодзіць адна другой, нашмат важнейшы. Тут стаўка не адных выбараў, а парлямэнцкае культуры будучае дэмакратычнае Беларусі.

Беларуская эканамічная мадэль здаецца эфэктыўнай, асабліва ў сьвятле статыстыкі. На справе шмат што ў ёй паўтарае савецкія часы, калі плянавікі і партыя давалі справаздачы аб дасягненьнях гаспадаркі, а тым часам на паліцах у крамах зьнікалі апошнія шкарпэткі. Эканаміст Уладзь Калупаеў аналізуе наступствы росту цэнаў на газ для беларускай эканомікі на **старонцы 4**.

Цікавыя гістарычныя паралелі праводзіць Усяслаў Шатэрнік у нарысе пра першага прэзыдэнта Злучаных Штатаў Амэрыкі Джорджа Вашынгтона (**старонка 7**). Калі ўжо й мы дачакаем сваіх Вашынгтонаў з новым ды праведным законам… А дачакаемся калісь! — адказваў паэт-прарок.

Барыс Тумар

Апазыцыя аб'ядналася ў Вільні

Тры дзясяткі лідэраў беларускай апазыцыі зь «Пяцёркі+», «Свабоднай Беларусі», «Маладой Беларусі» і «Рэспублікі» ўзгаднялі ў Вільні дзеяньні ў выбарчай кампаніі. Чаму ў Вільні? «Вільня — гэта месца, дзе лёгка дыхаецца і дзе можна свабодна размаўляць паміж сабою, не баючыся, што нехта падслухоўвае», — кажа лідэр АГП Анатоль Лябедзька. Была падпісаная дамова, зьмест якой пакуль не абнародуецца. Гаворка можа ісьці пра супрацоўніцтва ў назіраньні і падзел акругаў паміж дэмакратычнымі кандыдатамі. Паводле слоў лідэра БНФ Вінцука Вячоркі, дамоўлена «спыніць нападкі і нядобрыя выказваньні» ў адрас калегаў па дэмакратычным руху. Хто першы парушыць — той не мужык.

Алег Тачоны

Рада БНР пра газ

19 лютага Рада БНР зрэагавала на спыненьне паставак газу ў Беларусь заявай. «Лукашэнка атрымоўвае вынік той палітыкі, якую ён пасьлядоўна праводзіў амаль дзесяць гадоў». Рада БНР лічыць неабходным як найхутчэй дэнансаваць г.зв. «саюзныя» беларуска-расейскія «дамовы», аднавіць самастойную мытню, выйсьці з сыстэмы калектыўнай бясьпекі СНД, вывесьці расейскія вайсковыя базы з тэрыторыі краіны. Беларусь «здольная скарыстаць сваё ўнікальнае геапалітычнае становішча», — мяркуе Рада. А найважнейшым рэсурсам былі і застаюцца талент і працаздольнасьць беларускага народу.

ДАСЛОЎНА

Віктар Хрысьценка, в.а. прэм'ер-міністра Расеі: Экспансія!

У апублікаваным пры канцы студзеня ў газэце «Ведомости» артыкуле Віктар Хрысьценка пісаў, што шлях «закрытасьці» (арыентацыі на ўнутраныя рэзэрвы) і шлях «адкрытасьці» (паскоранай лібэралізацыі) маюць свае рызыкі. Хрысьценка выступае за «трэці шлях»: паступовае пашырэньне «межаў даступнага рынку», найперш за кошт краінаў СНД. Ідэі Хрысьценкі скіраваныя на мяккую эканамічную экспансію ў рамках традыцыйнага арэалу расейскага ўплыву і традыцыйных гаспадарчых мэханізмаў гэтага ўплыву. Яны не патрабуюць ні мадэрнізацыйнага прарыву, ні рашучае зьмены ўнутрыпалітычных і адміністрацыйных правілаў гульні.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Першы губэрнскі

Чэмпіянат Эўропы па біятлёне нагадаў адкрытае першынство СССР. Наймацнейшыя спартоўцы сьвету яго праігнаравалі. А камэнтаваць спаборніцтвы і для БТ, і для расейскіх каналаў адначасова запрасілі расейца Губерніева. Той, нахабна карыстаючыся службовым становішчам, прапагандаваў на беларускую тэлепрастору расейскіх спартоўцаў, час ад часу «робячы паблажкі» гаспадарам. Чалавек, які глядзеў трансьляцыі дзе за мяжой, не здагадаўся б, што чэмпіянат адбываўся ў Беларусі. Падумаў бы — у нейкай расейскай губэрні. Ні слова па-беларуску, ні павагі да сябе.
А на стадыёне ў Раўбічах у апошні дзень спаборніцтваў сабраліся 80 тысячаў заўзятараў (на фота), каб падтрымаць беларускую каманду. Яна ў выніковым камандным заліку сабрала найбольшую колькасьць мэдалёў.

ТэлеСлухач

АСОБЫ ТЫДНЯ

Андрэй Клімаў

Былы бізнэсмэн, дэпутат, а пасьля палітвязень зьбіраецца выставіць сваю кандыдатуру на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 году. Дзеля гэтага ён выйшаў з шэрагаў Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

Уладзімер Пуцін

пераварыў Расею ў непрадказальную краіну. На аўторкавую адстаўку прэм'ера Касьянава маскоўская фондавая біржа адказала падзеньнем індэксу актыўнасьці.

Якое нізкае падзеньне

Аляксандар Лукашэнка пакінуў першую дзясятку ў сьпісе дыктатараў сьвету, які штогод публікуе часопіс «Parade». А.Лукашэнка «зьехаў» на 15-е месца. На 10-м месцы ў рэйтынгу найжахлівейшых дыктатараў сьвету, якое летась займаў Лукашэнка, сёлета апынуўся кароль Свазыленду Мсваці III.

А хто гэты Мсваці?

38% з 1,1 мільёна яго падданых — ВІЧ-інфікаваныя, 40% ня маюць працы. А кароль будуе палацы для жонак, грашовую дапамогу ад ААН укінуў у будаўніцтва аэрапорту «Міленіюм», якім не карыстаецца ніводная авіякампанія, аквапарку і двух стадыёнаў. На 11-е з 8-га месца ў рэйтынгу за год сышоў Муамар Кадафі, зусім выбыў Садам Хусэйн. На першым месцы па-ранейшаму Кім Чэн Ір.

ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

Цноту за веды

18-гадовая студэнтка Брыстальскага ўнівэрсытэту Розі Рэйд, ня маючы чым плаціць за навучаньне, выставіла на аўкцыён сваю цнатлівасьць. Найбольшую суму, 8400 фунтаў, прапанаваў 44-гадовы мужчына. Учынак Розі — самая экзатычная з акцыяў пратэсту супраць рашэньня брытанскага парлямэнту, які падвысіў плату за навучаньне ў ВНУ.

Касьмічны алмаз

Астраномы знайшлі ў небе алмазную зорку вагой у 10^{34} каратаў. Гэты згустак крышталізаванага вугляроду дыямэтрам у 1500 км знаходзіцца на адлегласьці 50 сьветлавых гадоў ад Зямлі ў сузор'і Кентаўра. Алмаз — ядро колішняе зоркі, што ператварылася ў «белага карліка», то бок выпаліла ўсю сваю энэргію. Такі самы лёс чакае праз 5 млрд гадоў нашае Сонца. Алмаз назвалі Люсі ў гонар песьні «Бітлз».

ЛЕВЫМ ВОКАМ

Новая мадэль маскуліннасьці

На месцы міністра абароны Мальцава 23 лютага я б упаў у глыбокі запой. Каб ня бачыць маразматычнага заўтра.

Новыя часы ідуць у ваенкаматы. Раней толькі дзівак не касіў. Памятаю, як падчас мэдагляду «аўтарытэты» з старэйшае клясы інструктавалі нас: «На пытаньне псыхіятра «Якая сталіца Таджыцкай ССР?» трэба адказваць — «Масква». Інакш пойдзеш у Аўган». Цяпер вены, сколатыя «герай» або расьпіленыя лязом падчас дэпрэсьняку, рэтушуюць касмэтыкай. Магчыма, мы яшчэ пабачым цэнтралізаваны мэдагляд накшталт агульнадзяржаўнага іспыту ў ВНУ. БРСМ таксама знойдзецца месца. Ён будзе разглядаць скаргі тых, хто не набраў патрэбных балаў.

Пераняўшы ў расейцаў патрыятычную рыторыку, «Нашы новости» абвясьцілі мінулае 23 лютага сьвятам. Сьвятам вяртаньня беларускаму войску прэстыжу, згубленага за часы перабудовы. Індэксам канкурэнтаздольнасьці лэйблу УС на рынку масавай сьвядомасьці ёсьць, на думку журналістаў, конкурс у ваенкаматах. Навабранцы рвуць адно інтымнае месца, каб патрымаць калаш і пачысьціць ачко.

Але за фэномэнам конкурсу ў войска стаіць не патрыятычны экстаз, а матэрыяльныя праблемы: няздольнасьць бюджэту забясьпечыць усіх людзей прызыўных гадоў парцянкамі і працай. Толькі БТ ня ведае, што бяз дэмбельскага альбому атрымаць запаветныя сьвісток і дручок (мент — папулярны джоб у асяродку неадукаваных тынэйджэраў) амаль немагчыма.

Галоўны сацыякультурны вынік рэформы войска — санкцыянаванае дзяржавай разбурэньне мадэлі маскуліннасьці. Вайсковы білет канчаткова перастаў быць групавой адзнакай мужчынскага полу. На любімую завязку гапаты: «А ты ў войску служыў?» — любы нефармал можа сьмела казаць: «Хацеў пайсьці, але ваенкам браў хабар. Башлёў не хапіла нават на будбат».

У Беларусі пачалася эра новай мадэлі мужчынскіх паводзінаў. У войску служаць ужо ня ўсе, а толькі «лучшыя парні маёй страны».

Дзяржава яшчэ можа прытармазіць гэты працэс, яшчэ можна ўвесьці ў войску платныя аддзяленьні, аднак Мальцаву і К° гэта ўжо не дапаможа.

Лёлік Ушкін

Злачыннасьць: тэндэнцыі

За 10 гадоў па ўсіх парамэтрах вырасла злачыннасьць: ад 103 321 выпадку ў 1993 г. да 151 172 у 2003-м. Раскрывальнасьць за гэты пэрыяд зьнізілася з 63,5% да 59,7%.

Самы папулярны ў краіне крымінал — рабунак. Колькасьць выпадкаў вырасла з 1131 (раскрывальнасьць 77,8%) да 4003 (55,5%). А ў 2002-м быў зафіксаваны аж 6791 выпадак. На другім і трэцім месцы — кватэрныя крадзяжы й угон аўтатранспарту. Колькасьць выпадкаў незаконнага абарачэньня наркотыкаў павялічылася з 1263 да 5599. У паўтара разу вырасла колькасьць злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку, нораваў.

На 1998 г. прыпаў пік забойстваў — 1228 (летась было 1079).

Падае колькасьць згвалтаваньняў. У 2003-м іх было зафіксавана 432 — на 240 меней, чым у 93-м.

Паменела й эканамічных злачынстваў. Адбылося іх «перапрафіляваньне»: выпадкаў хабарніцтва стала больш у 2,5 разу (да 1337), у 2,9 разу паболела фальшываманэтчыкаў.

СМ; БелаПАН

Газавы канфлікт у пытаньнях і адказах

Працяг са старонкі 1.

Тут ён разглядаецца як ізгой, палітычныя адносіны Беларусі з Эўразьвязам пагаршаюцца. Да каго яму было зьвяртацца па абарону? Ён патрапіў у ізаляцыю і ад Расеі, і ад Захаду. Ён зараз будзе вымушаны зрабіць сур'ёзны выбар — ці далей інтэграваць з Расеяй, ці шукаць выхады на Эўразьвяз.

Шаміль Басаеў выказаў нечаканую вэрсію: перапынак у пастаўках газу выкліканы не беларускай запазычанасьцю, а неабходнасьцю ўратаваць Маскву. 18 лютага брыгада шахідаў узарвала магістральныя газаправоды, якія «працавалі» на ацяпленьне расейскай сталіцы. Верагоднасьць вэрсіі падважвае й тое, што яна была абнародаваная не адразу пасьля падзеяў.

Як зрэагавала беларуская прамысловасьць і людзі?

Руслан Равяка, Баранавічы:

— Калі адбылося адключэньне газу, на баранавіцкія прадпрыемствы, што маюць свае кацельні, прыйшоў загад з выканкаму рыхтавацца да пераходу на мазуту. Ужо некалькі год усе прадпрыемствы ў справаздачах сьцьвярджалі, што вельмі лёгка й хутка могуць зрабіць той пераход.

Аднак у сапраўднасьці шмат дзе мазутасховішчы даўно не выкарыстоўваліся, а таму падаць зь іх мазуту было складана, хоць рэзэрвовы запас яе быў ва ўсіх. Энэргетыкі на прадпрыемствах ня верылі, што некалі надыдзе такі дзень, калі давядзецца аднаўляць старыя сыстэмы. Да таго ж, тона мазуты каштуе каля 140 даляраў, дый выкарыстаньне гэтага паліва адразу ж парушыла б усе зацьверджаныя экалягічныя нормы.

За дзень, аднак, большасьць прадпрыемстваў здолела адрамантаваць і ўзнавіць сыстэму выкарыстаньня мазуты — спэцыялісты корпаліся на кацельнях цэлыя суткі. Акрамя таго, мелася распараджэньне выканкаму аб дзяжурстве ўначы на прадпрыемствах галоўных энэргетыкаў і іх намесьнікаў. Гарапахі павінны былі чакаць гадзіны Х, калі скончыцца падача газу і тэрмінова трэ будзе пераключацца на мазуту. Рашэньне гэтае потым ад радасьці забыліся своечасова адмяніць, і небаракі прадзяжурылі яшчэ й суботу.

На шчасьце, адключэньня газу не адбылося. Хаця ў вобласьці на невялікія прадпрыемствы прыяжджалі газавікі й закручвалі засланкі, не чакаючы нават сканчэньня тэхналягічнага працэсу.

Сярод насельніцтва гораду ўзрасьлі патрыятычныя і антырасейскія настроі. Едучы ранкам у аўтобусе, можна было адчуць сябе ў віртуальнай краіне прэзыдэнта Пазьняка. Чуліся нават жартаўлівыя вэрсіі аб помсьце расіянаў за прайграны тэнісны турнір. Шмат хто задаволена сьцьвярджаў, што як толькі расейцы скончылі падачу газу ў Беларусь, дык амаль адразу на расейскай станцыі ракетнага папярэджаньня «Баранавічы» адключылі электрычнасьць і расейскім вайскоўцам давялося пераходзіць на аварыйнае асьвятленьне.

Усе клялі расейцаў і хвалілі Лукашэнку.

Сяргей Антусевіч, старшыня Незалежнага прафсаюзу ААТ «Горадня-Азот»:

— Праца не спынялася. Але калі б не аднавіліся пастаўкі газу, прадпрыемства было б спынена 19-га ўначы. Апошні раз падобнае здаралася ў 1993 г. У нас безвыходнае становішча, бо ніякіх іншых крыніцаў энэрганосьбітаў, акрамя расейскага газу, ня маем. Што да работнікаў прадпрыемства, якіх у нас сем тысячаў, дык шмат хто проста ня верыў у магчымасьць адключэньня газу. Усе рэагавалі на падзеі спакойна. Прывыклі людзі жыць у самых цяжкіх умовах.

Марат Афанасьеў, дэпутат Жлобінскага райсавету, працуе на Беларускім мэталюргічным заводзе:

— На заводзе былі ўведзеныя абмежаваньні і зьдзяйсьняўся кантроль за выкарыстаньнем газу ў вельмі жорсткім рэжыме. Што да астатніх аб'ектаў, дык іх энэргазабесьпячэньне засталося на ранейшым узроўні. Толькі што кацельні былі падрыхтаваныя да пераводу на мазуту.

Дык ці браў на сябе нефармальныя абавязацельствы Лукашэнка перад выбарамі? Чаму так насядае «Газпром»?

Аляксандар Фядута, журналіст:

— Я перакананы, што нефармальныя абавязацельствы ён браў. Гэта відаць з паводзінаў расейскіх СМІ, з прысутнасьці ў іх беларускай тэматыкі і зь пераменаў ацэнкі сытуацыі ў нашай краіне.

Аляксандар Казулін:

— Я думаю, што і так усё зразумела. Нічога больш не магу дадаць.

Як зрэагаваў сьвет?

Нямецкая прэса: Тое, чым займаюцца ўрады Беларусі й Расеі, — гэта некарэктная гульня. Лукашэнка адцягвае ўвагу ад сутнасьці праблемы. Ён мусіць нарэшце стварыць спрыяльны клімат для замежных інвэстыцый — або зьмяніўшы свае погляды, або сышоўшы ў адстаўку.

Юры Дракахруст, аглядальнік радыё «Свабода»:

— Расейскія адмыслоўцы казалі, што калі справа дойдзе да адключэньня транзыту, то немцы і палякі будуць абурацца і выстаўляць прэтэнзіі да Беларусі, якая сваімі паводзінамі вымусіла «Газпром» спыніць транзыт. Польская рэакцыя была супрацьлеглай. Кіраўнік польскага ўраду Лешак Мілер паставіў пад сумнеў надзейнасьць Расеі як пастаўшчыка газу. Міністар эканомікі Яцак Пяхота заявіў пра фінансавую адказнасьць менавіта расейскіх пастаўшчыкоў. Ужо ў дзень адключэньня транзыту газу праз Беларусь Польшча падпісала мэмарандум пра магчымасьць пашырэньня паставак газу з Нарвэгіі.

Што будзе 29 лютага? Зноў адключаць ці не?

Валеры Дашкевіч:

— Газ могуць і не адключыць. Можа паўтарыцца нядаўняя сытуацыя, калі расейцы абмежавалі пастаўкі газу ў Беларусь у тым аб'ёме, які спажывае нашая краіна. Але на гэты раз прэзыдэнт можа ня даць загаду на несанкцыянаваны забор газу, які ідзе ў Эўропу. Праўда, ёсьць тут адзін момант. Справа ў тым, што да таго часу павінна быць падпісаная дамова аб транзьце газу праз Беларусь. Пакуль яе няма — па нашых трубах будзе ісьці «кантрабандны» газ, зь якім можна рабіць што хочаш...

«НН»: Ці паўплывае на сытуацыю адстаўка расейскага ўраду?

В.Д.: Думаю, што не. Урад Касьянава якраз ня ўмешваўся ў канфлікт, увесь цяжар узяў на сябе «Газпром».

Вольга Губенка, эканамічны аглядальнік газэты «Известия»:

— На сераду (размова адбывалася ў аўторак, 24 лютага. — **СЁ**) запланаваныя перамовы паміж «Белтрансгазам» і «Газпромам». Павінна адбыцца падпісаньне доўгатэрміновага пагадненьня на пастаўкі газу ў Беларусь. Думаю, што на гэты раз яны дамовяцца.

«НН»: Адстаўка ўраду Касьянава неяк паўплывае на перамоўны працэс?

В.Г.: Безумоўна паўплывае, але пакуль няясна, якім чынам. Віцэ-прэм'ер Хрысьценка, які выконвае абавязкі прэм'ера, у курсе гэтай тэмы. Раней ён ужо абмяркоўваў яе і з Лукашэнкам, і зь Сідорскім, і зь Сямашкам.

Ці можа Беларусь некалі зусім застацца бяз газу?

Зьміцер Крат, аглядальнік газэты «Советская Белоруссия»:

— Думаю, што гэта немагчыма і з тэхнічных, і з палітычных прычынаў. Нерэальна.

Ці магчымыя тэктанічныя зрухі ў беларускім палітычным краявідзе ў Беларусі, калі газавы шантаж зацягнецца?

Віталь Сіліцкі, палітолаг:

— Я б не называў гэтай сытуацыі «газавым шантажом», бо Беларусь набывае газ у Расеі па 50 даляраў, а не па 110, як Польшча. Наагул, шантажуюць тых, хто «падстаўляецца» сам, хто разьлічвае на «халяву». Думаю, што Беларусь і надалей будзе працягваць «падстаўляцца», а каардынальных палітычных зьменаў ня будзе. Бо ўсе гэтыя зьмены ў дачыненьнях з Расеяй адбываюцца разам з палітычнымі зьменамі ўнутры краіны, а ўлады робяць усё магчымае, каб іх не адбылося.

Юры Пракопаў, аглядальнік Першага нацыянальнага тэлеканалу:

— Імавернасьць таго, што газавы шантаж зацягнецца, невысокая. Таксама малаімаверна, што праз яго адбудуцца зьмены ў грамадзка-палітычных працэсах у краіне. Наадварот, адбылася кансалідацыя ў грамадзтве, незалежна ад палітычных поглядаў людзей.

Валер Булгакаў:

— Пакуль няма эканамічных перадумоваў для гэтых зьменаў. Беларуская эканоміка і палітыка моцна зьвязаныя. Каб адбыліся нейкія кардынальныя зьмены, мы мусім перажыць імклівы і неабарачальны спад дабрабыту. Газавы шантаж ня можа быць падставаю для радыкальных зьменаў беларускага палітычнага поля. І ня думаю, што ён зацягнецца, бо гэта элемэнт сэзонны. Абвастрэньне газавых канфліктаў адбываецца пры канцы зімы.

Чаму і Расея, і Лукашэнка публічна прадэманстравалі сваю варожасьць і свой канфлікт?

Віталь Сіліцкі:

— Я маю гіпотэзу... Адзін дасьведчаны чалавек распавёў мне, што Масква распачала спэцапэрацыю па адхіленьні Лукашэнкі ад улады...

Зьміцер Крат:

— Гэта не публічны канфлікт. Быў адказ нашага прэзыдэнта на канкрэтную сытуацыю, калі нельга было прамаўчаць.

Валер Булгакаў:

— Расея не зусім публічна прадэманстравала сваю варожасьць і канфлікт. У ход пайшлі розныя тэхнічныя сродкі, якімі перакрываўся газ. А вось Лукашэнка публічна прадэманстраваў сваё стаўленьне да расейскага кіраўніцтва.

Лукашэнка, як вопытны палітык, вельмі добра адчувае сябе ў стыхіі публічнай палемікі, у стыхіі буйнога палітычнага скандалу. Такімі сваімі публічнымі выказваньнямі ён падаграваў адзін са сваіх важных электаральных альбо ідэалягічных рэсурсаў — гэта пошук і выбудова нейкага ворага. Мы зьяўляемся сьведкамі, што на гэтае месца ўсё больш упэўнена прыходзіць Расея.

І адзін, і другі бок выкарыстоўваюць тактыку бізуна і перніка — канфрантацыйныя моманты зьмяняюцца нейкімі публічнымі адкатамі, залагоджваньнямі, пацалункамі.

Якія мэты ставіць Расея?

Сяргей Караганаў, старшыня Рады замежнай і абароннай палітыкі, у інтэрвію «Независимой газете»:

— Нас цікавіць не далучэньне Беларусі, нас цікавіць яе інтэграцыя з расейскай эканомікай.

Паўлюк Быкоўскі, «Белорусский рынок»:

— Расея зацікаўленая ў пашырэньні межаў даступнае сабе аднароднае эканамічнае прасторы, што выходзіць за межы палітычнае мапы РФ. Саступка «Белтрансгазу» не вырашае гэтае праблемы, а вось стварэньне Адзінае эканамічнае прасторы — вырашае, нават калі труба застаецца беларускай уласнасьцю.

Валер Булгакаў:

— Мэта Расеі — ператварэньне блізкага замежжа ў зону, якая стымулюе эканамічны рост у самой Расеі. Каб беларуская гаспадарка працавала не для дабра беларускага народу, а для ўзбагачэньня расейскіх капіталістаў. Каб найбольш прыбытковыя прадпрыемствы працавалі на расейскіх уласьнікаў.

Што мяркуе пра крызыс інтэлігенцыя?

Іван Шамякін, народны пісьменьнік Беларусі:

— З боку расейцаў гэта вельмі непрыгожая, недружалюбная акцыя.

Адам Мальдзіс, прафэсар:

— Гэтага трэба было чакаць. Ня маючы розных крыніцаў паставак газу, Беларусь застаецца пад пагрозай шантажу. Фактычна мы пабачылі водгукі старых імпэрскіх амбіцыяў у дачыненьні да нашай краіны. Нібыта вярнулася XIX стагодзьдзе...

На якія саступкі можа ўрэшце пайсьці беларускае кіраўніцтва?

Зьміцер Крат:

— Ніякіх саступак няма і ня будзе. Ёсьць пэўныя дамоўленасьці, ад якіх мы не адмаўляемся.

Але аддаваць бясплатна нічога ня будзем.

Ці адносіны Расеі й Лукашэнкі атручаны газам назаўжды? Ці вяртаньне да ранейшага стану магчымае?

Натальля Пяткевіч, выказваючы пазыцыю А.Лукашэнкі:

— Беларускія ўлады ня зьвязваюць адстаўкі кабінэту Касьянава зь нядаўнім спыненьнем падачы газу: рашэньне пра газавую блякаду цэлага народу ў 20-градусны мароз мог прыняць толькі асабіста прэзыдэнт Расеі.

Валер Булгакаў:

— Вяртаньне да ранейшага, з 1995—1996 г., стану адносінаў немагчымае, бо адбываецца трансфармацыя ўзаемнага ўспрыманьня, разьмежаваньне на ўзроўні ідэалягічным, псыхалягічным... Гэтае «атручаньне газам» зноўку паказвае ўсю слабасьць канструкцыі «саюзнай дзяржавы» як штучнага твору, які быў навязаны палітычным элітам, у пэўнай ступені зьверху, а ня быў вынікам натуральнага грамадзкага разьвіцьця. Але магчымае вяртаньне да таго статус-кво, які існуе ў апошнія некалькі гадоў, бо расейцы не перастаюць паважаць Лукашэнку за тое, што ён робіць зь беларускай культурай, беларускай мовай і іншым, што яны лічаць вельмі важным.

Частка расейскай палітычнай эліты ўспрымае Лукашэнку як свайго апошняга стратэгічнага партнэра на постсавецкай прасторы, і здача яго нанесла б істотны ўдар па астатніх лідэрах постсавецкіх дзяржаваў, якія пабачылі б, што расейскасьць не гарантуе палітычнага выжываньня.

Юры Пракопаў:

— Зразумела, асадак альбо рубец на сэрцы застануцца. Але гэта трэба будзе загнаць далей, дзеля дабра нашай жа дзяржавы.

І што гэта азначае для нацыянальнага руху, для ўмацаваньня дзяржаўнасьці?

Валер Булгакаў:

— Нацыянальны рух атрымлівае пэўны палітычны шанец, які ён ужо пачаў выкарыстоўваць. Яго пазыцыю засьведчылі прадстаўнікі БНФ, схільныя тлумачыць газавы канфлікт тупіковай эканамічнай палітыкай Лукашэнкі. Па-свойму яны маюць рацыю. Увогуле гэты канфлікт не пакінуў нікога абыякавым. Гэта як той камень, які ўпаў у раку і ад якога пайшлі хвалі. Яны, напэўна, дойдуць да кожнага палітычна актыўнага беларуса.

Ужо ня першы год відавочна, што пытаньне страты дзяржаўнасьці на парадку дня не стаіць. Лукашэнка, ягоны аўтарытарны стыль кіраўніцтва па-свойму, як ні парадаксальна, зьяўляюцца зарукай беларускай дзяржаўнасьці. Але, як і кожная аўтарытарная форма кіраваньня, яна вельмі хісткая і патэнцыйна падатлівая на розныя вонкавыя ўзрушэньні.

Уладзімер Ягораў, генэрал-палкоўнік, дэпутат палаты прадстаўнікоў, старшыня камісіі па нацыянальнай бясьпецы:

— Расея ўсё ж свайго даможацца...

«НН»: Значыць, Лукашэнка здаўся, прайграў?

У.Я.: Ён ня здаўся. Наадварот, паводзіў сябе па-байцоўску.

«НН»: І чаго нам цяпер чакаць?

У.Я.: Рынкавых адносінаў. Нам даўно трэба было на іх пераходзіць.

«НН»: А ці існуе пагроза для незалежнасьці Беларусі?

У.Я.: Не, не існуе.

Апытваў Сяргей Ёрш

Не кажы ВУП

Рост цэнаў на газ і эканамічная сытуацыя

Нэрвовыя паводзіны беларускіх улад падчас перамоваў з «Газпромам», намер ураду ўзяць крэдыт на пакрыцьцё розьніцы ў кошце газу ўказваюць на тое, што павышэньне цэнаў Расеяй можа паставіць пад сумнеў абвешчанае паскарэньне эканомікі і ўсю так званую беларускую эканамічную мадэль. З другога боку, ужо з 1 студзеня гэтага году для канцавых спажыўцоў былі павышаны адпускныя цэны на газ з $54 да $67 за тыс. м^3. І гэта не зашкодзіла ім перавыканаць плянавыя паказьнікі за студзень 2004 г. Як рапартуе дзяржаўная статыстыка, выпуск прамысловай прадукцыі павялічыўся за студзень на 11,3% проці мінулага году, інфляцыя скарацілася да 1,9%, на 28,4% вырасьлі інвэстыцыі ў асноўны капітал (летась у студзені было падзеньне на 0,4%), нарэшце — праверце кішэні — рэальныя грашовыя прыбыткі насельніцтва ўзьняліся на 13%. Што ж у рэальнасьці значыць для функцыянаваньня беларускай эканамічнай мадэлі зьмяненьне ўмоваў гаспадараньня ў выглядзе павышэньня цаны на газ?

$200 млн — гэта многа або мала?

Перш чым ацэньваць магчымыя наступствы павышэньня цэн на газ, неабходна ўдакладніць, пра які дадатковы цяжар на эканоміку вядзецца гаворка.

Хоць дзяржаўныя СМІ, як і ў ранейшыя гады, імкнуцца стварыць уражаньне, што танны газ — гэта не прэфэрэнцыя з боку Расеі, а проста плата за такія ж прэфэрэнцыі з боку нашай краіны, разьлікі паказваюць адваротнае. Цяпер, калі агучаны цэнавыя парамэтры газу і транзыту на бліжэйшую пэрспэктыву, можна сьцьвярджаць, што «прэфэрэнцыя згубленых магчымасьцяў» вымяраецца для Беларусі сумай $200 млн.

З аднаго боку, розьніца паміж новай цаной на газ ($50) і сярэднеўзважанай цаной 2003 г. ($36) пры жаданым спажываньні 20 млрд м^3 патрабуе дадаткова знайсьці $280 млн. З другога боку, пры павышэньні транзытнага тарыфу з $0,54 да абвешчанага «Газпромам» $1,02 за 1 тыс. м^3 газу на 100 км дадатковы даход (беларускі газаправод мае ўдоўжкі 560 км) складзе $80 млн. Такім чынам, розьніца пры новых цэнавых прапорцыях, без уліку магчымага перагляду іншых саюзных дамоўленасьцяў, выходзіць на тыя самыя $200 млн, якія Мінфіну было даручана ўзяць у Расеі ў выглядзе крэдыту.

Што тычыцца астатніх прэфэрэнцый, якія нібыта Беларусь аказвае Расеі, то перавесьці іх на рынкавыя ўмовы даволі складана, бо гэта можа выклікаць з боку Расеі меры ў адказ.

Напрыклад, каб тутака «ня поўзалі» расейскія перавозьнікі, можна падняць для іх цэны на чыгуначны і аўтамабільны транзыт, але і Расея можа зрабіць «выключэньне» ды падняць цэны за транзыт беларускіх тавараў праз сваю тэрыторыю.

Можна таксама выставіць рахунак Расеі за ахову дзяржаўнай і ўладкаваньне мытнай мяжы, выдаўшы іх за саюзныя, але тады і Расея можа выставіць Беларусі рахунак за ўладкаваньне, напрыклад, Далёкага Ўсходу.

Што тычыцца абслугоўваньня комплексаў супрацьпаветранай абароны, якое ацэньваецца беларусамі ў $40 млн, то прывязваць гэта да газавай праблемы нельга.

Беларусі лепей ня ўвязвацца ў гандлёвую вайну з Расеяй, бо яе вынікі для нерэфармаванай беларускай эканомікі могуць быць куды больш трагічнымі, чым асобны выпадак з газам. Любая з магчымых мераў у адказ з боку Расеі, як, напрыклад, патрабаваньне 100%-х разьлікаў за газ у грашовай форме,

> Доля энэрганосьбітаў у сабекошце беларускай прадукцыі вырасьце з 12% да крыху больш чым 13%. Для параўнаньня: у Эўропе гэты паказьнік складае 2%.

непрыманьне адтэрміновак запазычанасьці, якая дакладна будзе расьці, а ў крайнім выпадку — далейшае павышэньне цаны на газ да ўзроўню краінаў Балтыі ($80), можа паскорыць сыстэмны крызыс беларускай эканамічнай мадэлі.

Адключэньне газу канчаткова зацьвердзіла зьмяненьне геапалітычнай і геаэканамічнай абстаноўкі для Беларусі ў дачыненьнях з Расеяй. Цяпер атрымаць якую-небудзь аднабаковую прэфэрэнцыю ў межах міждзяржаўных адносінаў будзе практычна немагчыма. Возьмем, напрыклад, неўрэгуляванасьць ускосных падаткаў паміж дзьвюма краінамі, ад якой Беларусь, паводле некаторых разьлікаў, нясе страты, параўнальныя з сумай, якую прыйдзецца дадаткова патраціць на спажываньне газу па рынкавых цэнах. Нягледзячы на ўсе намаганьні беларускага ўраду, зрухаў у гэтым пытаньні не назіраецца.

Статыстыка не зрэагуе

Можна пагадзіцца з гіпотэзай, згодна зь якой Беларусь пасьля «паўстаньня масаў» у 1994-м праходзіць у эканамічным разьвіцьці ўсе этапы, якія прайшоў у свой час Савецкі Саюз, толькі шпарчэй (пэрыяд НЭПу, пэрыяд экстэнсіўнага разьвіцьця, пэрыяд паскарэньня, перабудова).

З уладнай устаноўкай аб неабходнасьці дасягненьня росту ВУП у памеры 10%, на мой погляд, быў пакладзены пачатак новага этапу разьвіцьця беларускай эканамічнай мадэлі — этапу паскарэньня.

Характэрна, што ўсяго толькі за некалькі тыдняў да пастаноўкі задачы паскарэньня, паводле пададзенага гадавога прагнозу, тэмпы росту ВУП на 6—6,5% на 2004 г. лічыліся вельмі напружанымі. Прайшла пара тыдняў, і плянавая лічба росту ВУП на 10% стала здавацца ўраду рэалістычнай! І як па чарадзействе на працягу першых тыдняў студзеня прадпрыемствы павялічылі выпуск прадукцыі на неабходную велічыню!

Цэнтралізаваная мадэль эканомікі, адноўленая ў Беларусі, дасягнула такой ступені адладкі, што пастаў зараз перад ёй задачу забясьпечыць рост ВУП хоць на 20%, яна яго выканае. Тое самае тычыцца і практычна ўсіх астатніх 16 паказьнікаў, абавязковых да выкананьня.

Незалежныя эканамісты шматкроць адзначалі недатрыманьне статыстычнымі органамі міжнароднай мэтадалёгіі разьліку многіх эканамічных паказьнікаў. Напрыклад, індэкс спажывецкіх цэнаў, якім вымяраюць тэмпы інфляцыі, разьлічваецца ў Беларусі паводле ўсечанага пераліку тавараў і паслуг (350 замест неабходных 450). У рэальныя грашовыя даходы насельніцтва ўключаецца продаж насельніцтвам замежнай валюты, калі ён перавышае яе пакупку. Паказьнік ВУП разьлічваецца на аснове справаздачных форм, якія падаюцца самімі прадпрыемствамі, што самі распрацоўваюць мэтодыкі разьліку цэнаў на новыя віды прадукцыі, улік інфляцыі і г.д. Пры такіх падыходах неабходныя паказьнікі проста ня могуць не атрымацца.

Савецкай аналёгіяй пэрыяду, які мы цяпер перажываем, могуць быць 1970-я гады. Менавіта тады савецкае кіраўніцтва прызнала, што інвэстыцыі ў асноўны капітал не даюць аддачы, а тэхналягічнае адставаньне ад разьвітых краін пачынае пагражаць нацыянальнай бясьпецы. Было абвешчана пра пераход на інтэнсіўныя крыніцы эканамічнага росту. У Беларусі пасьля ўсьведамленьня немагчымасьці ўстойлівага доўгатэрміновага росту ВУП на аснове экспансіянісцкай грашова-крэдытнай палітыкі (было ўстаноўлена, што тут таксама працуе манэтарная тэорыя і непасрэдна ў Беларусі 1% росту грашовай масы прыводзіць прыкладна да 1% інфляцыі) было абвешчана пра пераход на інавацыйны шлях разьвіцьця.

Аднак у выніку агульнай неўспрымальнасьці плянава-дырэктыўнай эканомікі да тэхналягічнага прагрэсу і там, і тут усё зьвялося да пагоні за «валам». Крытэрам ацэнкі гаспадарчай дзейнасьці прадпрыемстваў зьяўляецца выкананьне даведзеных плянавых паказьнікаў. Такім чынам, адміністрацыйны рэсурс зьяўляецца сёньня галоўным інструмэнтам у пераадоленьні застою. У такіх умовах павышэньне цэн на газ практычна не адаб'ецца на дынаміцы эканамічных паказьнікаў, прынамсі сёлета.

Адчувальна, але не фатальна

Указаная сума для маштабаў эканамічнай сыстэмы Беларусі адчувальная, але не небясьпечная. Яна складае блізу 1% ад ВУП, каля 2,5% ад экспартнай валютнай выручкі прадпрыемстваў і 3% ад расходнай часткі бюджэту. Гэтая сума перакладзецца на прадпрыемствы, якія разьмяркуюць яе ў выдатках на вытворчасьць.

Удзельная вага энэрганосьбітаў у сабекошце прадукцыі вырасьце зь цяперашніх 12% да крыху больш чым 13%. (Для параўнаньня: у эўрапейскіх вытворцаў гэты паказьнік складае 2—2,5%.) Пры іншых роўных умовах гэта будзе азначаць скарачэньне рэальнай рэнтабэльнасьці прадукцыі на 2—3%, а таксама рост цэнаў на 7—8%.

Як паказваюць падзеі, урад пры пераходзе на рынкавыя разьлікі за газ не зьбіраецца разбураць існую схему пагашэньня пазыкі за яго ранейшыя пастаўкі. Адной з праяваў беларускай цэнтралізавана-кіроўнай эканомікі ёсьць тое, што прыбытковыя прадпрыемствы, а таксама насельніцтва плацяць за газ 120%, а стратныя прадпрыемствы маюць магчымасьць падтрымкі з боку рэзэрваў «Белтрансгазу», «Белпаліўгазу», дзяржбюджэту. Такім чынам, ня варта чакаць хвалі банкруцтваў.

А калі зь бюджэту?

Калі б спатрэбілася знайсьці гэтыя $200 млн зь іншых крыніц, напрыклад, за кошт іншых артыкулаў дзяржбюджэту, то пры складзеным узроўні цэнтралізацыі і пераразьмеркаваньня ВУП у Беларусі (парадку 35%) гэта не тварыла б асаблівых праблем.

Напрыклад, адмова ад адлічэньняў у бюджэт саюзу Беларусі і Расеі ўжо дала б каля $25 млн, адмова ад падтрымкі дзяржаўных СМІ дабавіла б яшчэ $30 млн, а самую вялікую эканомію магла б даць адмова ад падтрымкі неэфэктыўнай калгасна-саўгаснай сыстэмы. Зьніжэньне аб'ёму дапамогі ўсяго на 20% вызваліла б больш за $100 млн.

> Прыбытковыя прадпрыемствы і насельніцтва плацяць за газ 120%, а стратныя прадпрыемствы маюць падтрымку дзяржбюджэту.

Падтрымка сельскай гаспадаркі — гэта, бадай, самы яскравы прыклад таго, як ідэалягізаванасьць эканомікі можа спараджаць эканамічныя абсурды. Калі б урад адмовіўся ад падтрымкі АПК і забясьпечыў пастаўкі харчаваньня з-за мяжы, то выдача сродкаў, што выдаткоўваюцца на датацыі вёсцы, наўпрост работнікам сельскай гаспадаркі ў выглядзе дапамогі па беспрацоўі склала б каля $90 на кожнага ў месяц, замест $60, якія яны атрымалі ў выглядзе наліччэньняў намінальнага заробку ў 2002 г.

Таму нават пераразьмеркаваньне адных артыкулаў бюджэту на карысьць іншых, напрыклад, з угнаеньняў для сельскай гаспадаркі на газ для прамысловасьці, магчыма, нічога не зьмяніла б у самой беларускай эканамічнай мадэлі.

Акрамя таго, магчымыя іншыя крыніцы. У Беларусі адносна нізкая замежная запазычанасьць адносна ВУП — каля 10%. Паводле эўрапейскіх стандартаў, нармальнай лічыцца сытуацыя, калі яна не перавышае 60%. Таму нейкі час з назапашваньнем запазычанасьцяў за газ — а гэта несумненна будзе адбывацца — можна змагацца прыцягненьнем крэдытаў. Нарэшце, існуе важкая крыніца на крайні выпадак — прыбыткі ад продажу дзяржуласнасьці.

І тым ня менш, зьмены непазьбежныя.

Палісімэйкерам і дырэктарату стане яшчэ складаней выконваць даведзеныя плянавыя забавязаньні. Трохі падскочаць цэны, крыху зьнізіцца рэнтабэльнасьць, пачне расьці замежная запазычанасьць, вырасьце колькасьць стратных прадпрыемстваў, павысіцца інфляцыя, упадзе экспарт у Расею, давядзецца дэвальваваць рубель да амэрыканскага даляра і расейскага рубля, каб падтрымаць цэнавую канкурэнтаздольнасьць беларускай прадукцыі на расейскім рынку. Прыйдзецца канчаткова адмовіцца ад плянаў увядзеньня расейскага рубля…

Калі зыходзіць з доўгатэрміновых нацыянальных інтарэсаў, а не з патрэбаў цяперашняй эканамічнай мадэлі, то павышэньне цэн на газ для Беларусі — гэта пазытыўная зьява.

Разнастайныя прэфэрэнцыі Расеі былі своеасаблівым падмуркам рэліктавай на прасторах нашага рэгіёну эканамічнай мадэлі. Выбі яго, і ўстойлівая на першы погляд канструкцыя разваліцца, як картачны дамок. Сёньня гэта ўжо пачынае адбывацца. Адзінае, што праяву сыстэмнага крызысу ў Беларусі ня варта шукаць у паказьніках сучаснай статыстыкі альбо чакаць у выглядзе лякальных крызысаў на асобных рынках. Усьведамленьне гэтага крызысу грамадзкасьцю адбудзецца іначай, калі на фоне колькасных посьпехаў будзе відавочным рэзкае пагаршэньне эканамічнай сытуацыі ў краіне. (Як у савецкія часы, калі плянавікі і партыя давалі справаздачы аб дасягненьнях савецкай эканомікі, а тым часам на паліцах у крамах зьнікалі апошнія тавары).

Чым захаваньне цяперашняй эканамічнай мадэлі, для добрай эканамічнай і палітычнай пэрспэктывы Беларусі было б лепей, калі б Расея даціснула Беларусь, набыла ўсё тое, што пералічваў прэзыдэнт: газаправоды, энэргасыстэму, нафтаправоды. Разумею, што гэтая мая думка многім падасца спрэчнай. Аднак у палітычнай пэрспэктыве гэта абараніла б Беларусь ад магчымага пасураўленьня рэжыму пры канцы ягонага існаваньня. А ў эканамічнай пэрспэктыве гэта б спрыяла прарынкавай арыентацыі будучага ўраду, якому прыйшлося б глядзець у кірунку рэформаў і пошуку новай міжнароднай спэцыялізацыі на падмурку высокатэхналягічных вытворчасьцяў у новай Эўропе.

Нягледзячы на дасягненьні прапаганды і статыстыкаў у справе «дынамічнага» разьвіцьця беларускай эканомікі, падзеі і лічбы сьведчаць аб тым, што сапраўдны яе стан жудасны. Нерэфармаваная і неэфэктыўная, адсталая ад суседніх краінаў, яна можа існаваць толькі ў штучна створаных цяплічных умовах. Пераход на рынкавыя ўмовы нясе пагібель для нярынкавай гаспадаркі. Вось галоўная прычына газавай гістэрыкі і найбольшая выснова з усіх газавых падзей.

Уладзь Калупаеў,
аналітычная група
«Альтэрнатыва-XXI»

Мільён за Эўропу

Эўрапейская кааліцыя «Свабодная Беларусь» хоча сабраць мільён подпісаў грамадзянаў за ўступленьне ў Эўразьвяз. У яе разьліках гэта будзе аргумэнтам для пераарыентацыі краіны на Захад.

Беларуская апазыцыя ў апошнія гады асьцярожна ставіцца да ініцыятываў са зборам подпісаў. Задача гэта няпростая, існуе вялікая імавернасьць правалу. Апошні прыклад — збор подпісаў за зьмены ў выбарчым заканадаўстве, які летась ініцыявала дэпутацкая група «Рэспубліка». Невядома, калі ён скончыцца і ці скончыцца наагул.

Рэкорд у найноўшай гісторыі Беларусі належыць БНФ, які ў 1992 г. сабраў подпісаў 442 тысячы, патрабуючы датэрміновых выбараў Вярхоўнага Савету. Аднак парлямэнт сабатаваў ініцыятыву фронтаўцаў і акцыя не была даведзеная да лягічнага канца. «Свабодная Беларусь» спадзяецца сабраць мільён. Праўда, на працягу году.

Ініцыятары лічаць, што людзям будзе няцяжка тлумачыць, за што ім прапануецца падпісацца. Эўразьвяз і эўра — рэчы больш рэальныя і зразумелыя, чым «прэзыдэнцкія выбары пад міжнародным пратэктаратам», за правядзеньне якіх зьбіралі подпісы сябры КХП-БНФ.

У прэсавай канфэрэнцыі Эўракааліцыі, якая адбывалася ў офісе БСДП (НГ) на вул.Мясьнікова, ля самага Дому ўраду, акрамя Статкевіча бралі ўдзел лідэр «Хартыі'97» Андрэй Саньнікаў, актывіст прадпрымальніцкага руху Леанід Малахаў і Валянціна Матусевіч з Жаночай партыі «Надзея».

Паводле М.Статкевіча, кампанія будзе адбывацца ў некалькі этапаў. Актыўная інфармацыйная атака адбудзецца ўвесну. Яе мэтады самыя звычайныя: канфэрэнцыя «Эўрапейскі шлях Беларусі», конкурсы для студэнтаў і школьнікаў, выпуск улёткі з кантактамі Эўракааліцыі ў большасьці райцэнтраў. Кульмінацыяй станецца сьвяткаваньне 1 траўня. А далей, як сказаў Саньнікаў, «зьбіраем подпісы і зьвяртаемся да кіроўных органаў Эўразьвязу».

М.Статкевіч паведаміў прысутным, што рэйтынг Эўракааліцыі ўжо вышэйшы за 16%, ды папрасіў не называць сацыялягічную структуру, якой замаўлялася гэтае дасьледаваньне. Кандыдатары «Свабоднай Беларусі» лічаць, што яны, у адрозьненьне ад «Пяцёркі+», знаходзяцца ў выйгрышнай сытуацыі. Калі Народная кааліцыя пацерпіць паразу на выбарах у палату прадстаўнікоў, ёй ня будзе чаго сказаць сваім прыхільнікам і спонсарам. А Эўракааліцыя ў любым выпадку будзе мець на руках мільён подпісаў — сьведчаньне рэальнай працы зь людзьмі.

Мікола Статкевіч мяркуе, што ў Беларусі выбар невялікі: альбо шлях у Эўропу, альбо непазьбежны аншлюс з Расеяй. На яго погляд, сёньня расейскае кіраўніцтва імкнецца ўсталяваць над Беларусяй ня толькі эканамічны, але й палітычны кантроль.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Тое самае апошнім часам заяўляюць і прадстаўнікі ўраду. У такой сытуацыі лягічна было б чакаць, што ініцыятыва Эўракааліцыі знойдзе падтрымку беларускіх уладаў. Ужо ў найбліжэйшы час каардынатары кампаніі зьвернуцца да кіраўніцтва Беларускага тэлебачаньня з просьбай даць ім магчымасьць растлумачыць грамадзянам «сэнс эўрапейскага шляху для Беларусі». А ну ж дадуць?

Сяргей Ёрш

Валянціна Матусевіч (Жаночая партыя «Надзея») і Мікола Статкевіч («Народная грамада») — надзейныя хаўрусьнікі

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На фота: сотня студэнтаў і школьнікаў узялі ўдзел у акцыі «Зубра» памяці зьніклых палітыкаў. Сямёра затрыманых трапілі ў пастарункі, але адразу ж былі адпушчаныя.

ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

19 лютага Аксану Новікаву затрымалі каля будынку Адміністрацыі прэзыдэнта. Яна раздавала чыноўнікам зварот ад грамадзянаў (больш за 100 подпісаў) супраць зносу прыватнага сэктару ў Менску й парушэньня жыльлёвых правоў. На яе склалі пратакол за «распаўсюд друкаваных выданьняў, выраблены з парушэньнем вызначанага парадку». Навапалацкага праваабаронцу **Зьмітра Салаўёва** 19 і 24 лютага выклікалі ў гарадзкую пракуратуру для тлумачэньняў. Нагода — наяўнасьць у горадзе «незарэгістраванай арганізацыі» — філіі ліквідаванага праваабарончага цэнтру «Вясна». Праваабаронца адмовіўся даваць інфармацыю, якая можа быць выкарыстаная супраць яго. Вышэйшы гаспадарчы суд 19 лютага адмовіў рэдакцыі **«Белорусской деловой газеты»** ў пазове да Міністэрства інфармацыі. Журналісты дамагаліся адмены папярэджаньня, вынесенага 26 сьнежня 2003 г. У «БДГ» цяпер 3 папярэджаньні, 2 зь якіх суд пакінуў у сіле, а 3-е рэдакцыя мае абскарджваць. Гэты ж суд адмовіў у рэгістрацыі прыватнаму выдавецкаму прадпрыемству **«Рэгіён-прэс»**, якое мелася выдаваць прыпыненую «Новую газету Сморгони». Камісія ў справах непаўналетніх Ленінскага раёну Менску вынесла актывістцы незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Юліі Бандарэнцы** папярэджаньне за ўдзел у акцыі «Час адказваць». Тады, 23 студзеня, падчас затрыманьня дзяўчына была зьбітая падпалкоўнікам міліцыі. Зьміцер Бандарэнка, бацька дзяўчыны, адзначыў, што камісія разглядала пратакол, складзены на аснове рапартаў міліцыянтаў, якія не затрымлівалі Юлі. Сябры **Незалежнага таварыства прававых дасьледаваньняў** 20 лютага падалі ў Вярхоўны суд касацыйную скаргу супраць ліквідацыі арганізацыі. У той самы дзень, праз адсутнасьць перакладчыка на беларускую мову, быў адкладзены суд над юрыстам зачыненага праваабарончага цэнтру «Вясна» **Уладзімерам Лабковічам**. Судзяць яго за несанкцыяваную акцыю пратэсту. Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта адмовіла **Беларускаму кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў** у працягу дамовы на арэнду памяшканьня. 22 лютага падчас акцыі, прысьвечанай зьніклым палітыкам, былі затрыманыя актывісты «Зубра»: у аддзеле міліцыі ў **Цімоха Дранчука**, **Паўла Юхневіча** і **А.Мізевіча** ўзялі тлумачэньні, пасьля чаго вывезлі ў аддалены раён гораду і выкінулі з машыны. 20 лютага на менскім рынку «Ўрурча-3» «для высьвятленьня асобы» быў затрыманы старшыня РГА «Пэрспэктыва» **Анатоль Шумчанка**, які прыйшоў па пакупкі. Міліцыянт, які не прадставіўся, хацеў праверыць, ці не знаходзіцца Шумчанка ў вышуку. Сп.Анатоль будзе скардзіцца ў пракуратуру. 23 лютага за пікет па амэрыканскага пасольства ў Менску з просьбай зьвярнуць увагу на антысэмітызм у Беларусі былі затрыманыя «маладафронтаўцы» **Зьміцер Дашкевіч**, **Марыя С.**, **Марыя Лось**, **Алесь Васілеўскі**, **Барыс** і **Кастусь Гарэцкія**, **Вадзім Бялыня**, **Аляксей Завідаў**. Сяброў Віцебскай філіі КХП-БНФ **Уладзімера Плешчанку** й **Аляксандра Салаўяна** затрымалі 24 лютага за несанкцыяванае пікетаваньне каля Віцебскага райвыканкаму.

АШ

Скаргі – поштай

Вас, хутчэй за ўсё, ня раз абурала, калі на этыкетцы айчыннага вытворцы харчаваньня ёсьць надпісы амаль на ўсіх мовах сьвету, акрамя беларускай. Або калі Вы прыходзілі, напрыклад, у банк ды не знаходзілі там аніводнага беларускага надпісу. Як змагацца з дыскрымінацыяй? Кожны раз спрачацца з чыноўнікамі да зьнікненьня пульсу? Скардзіцца? Так можна праскардзіцца ўсё жыцьцё.

Прапануем зручнае выйсьце. Каб зэканоміць Ваш каштоўны час, мы напісалі лісты-«балванкі». Першы адрасаваны кампаніі-вытворцы харчовых прадуктаў, на якіх адсутнічаюць надпісы па-беларуску. Другі ліст адрасаваны арганізацыі, якая ўнікае надпісаў па-беларуску ў афармленьні інфармацыйных стэндаў. Скарыстаўшыся з гэтых лістоў-«балванак», Вы з дапамогай звычайнай пошты зможаце хутка даслаць скаргу ў адпаведную арганізацыю.

Ліст 1.

«Камэрцыйнаму дырэктару кампаніі ..... (назва кампаніі-вытворцы)

Шаноўны спадар\спадарыня!

Перш за ўсё, ад імя пакупнікоў я хацеў бы выказаць падзяку Вашай кампаніі за высокую якасьць прадукцыі. Асабіста мне падабаецца ... (назва ўпадабанага прадукту) — высакаякасны прадукт з арыгінальным смакам.

Я заўважыў са зьдзіўленьнем, што прадукцыя Вашай кампаніі суправаджаецца надпісамі толькі на расейскай мове ды няма надпісаў на беларускай. Спадзяюся, што гэта ўсяго толькі невялікі недагляд.

Дазвольце растлумачыць правільнасьць выбару зьмяшчэньня надпісаў на этыкетках па-беларуску.

Па-першае, беларуская мова — гэта дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусі. Існуе закон, які абавязвае кампаніі зьмяшчаць суправаджальныя надпісы на этыкетках на дзьвюх дзяржаўных мовах (беларускай і расейскай). Невыкананьне гэтага закону цягне за сабой адміністрацыйныя спагнаньні.

Па-другое, беларускамоўнае насельніцтва складае вялікі працэнт ад агульнага ліку пакупнікоў. Адсутнасьць надпісаў па-беларуску падштурхоўвае яго аддаць перавагу прадукцыі іншай кампаніі, на этыкетках якой ёсьць такія надпісы.

Я заклікаю дадаць надпісы па-беларуску на прадукцыю Вашай кампаніі. Дзякуй за ўвагу да гэтага ліста.

З павагай, ... (Імя)»

Ліст 2

«Дырэктару басэйну «Блакітны» (ці назва іншай «упадабанай» установы)

Шаноўны спадар\спадарыня,

Перш за ўсё, ад імя наведнікаў я хацеў бы выказаць падзяку калектыву ... за высокую якасьць абслугоўваньня на працягу многіх гадоў. Асабліва гэта адчуваецца цяпер, пасьля капітальнага рамонту, калі басэйн стаў як ніколі прывабным і зручным для здаровага баўленьня часу.

Я заўважыў са зьдзіўленьнем, што новае афармленьне басэйну выканана толькі на расейскай мове, ды зусім няма надпісаў на беларускай. Гэта тычыцца шыльды на ўваходзе, інфармацыйных стэндаў, надпісаў і абанэмэнтаў. Спадзяюся, што гэта ўсяго толькі невялікі недагляд.

Дазвольце давесьці тут некалькі аргумэнтаў на карысьць зьмяшчэньня надпісаў па-беларуску.

Па-першае, беларуская мова — дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусі. Існуе закон, які абавязвае арганізацыі й прадпрыемствы зьмяшчаць інфармацыйныя надпісы на дзьвюх дзяржаўных мовах (беларускай і расейскай). Невыкананьне гэтага закону цягне за сабой адміністрацыйныя спагнаньні.

Па-другое, беларускамоўнае насельніцтва складае вялікі працэнт ад агульнага ліку наведнікаў. Адсутнасьць надпісаў па-беларуску падштурхоўвае яго аддаць перавагу іншаму басэйну, у афармленьні якога прысутнічаюць такія надпісы.

Я заклікаю Вас дадаць надпісы па-беларуску ў афармленьне басэйну.

Дзякуй за ўвагу да гэтайга ліста.

З павагай, ... (Імя)»

Посьпехаў Вам! Кропля точыць камень!

www.knihi.com

«Іслач» балотам цячэ

Спрэчка вакол пісьменьніцкага Дому творчасьці

Сход сяброў Літфонду, заплянаваны на 20 лютага, не адбыўся: не было кворуму. Зь неабходных 259 удзельнікаў (палова ад 517 сяброў арганізацыі) сабралася толькі 117. Несталічныя пісьменьнікі прыехаць не змаглі. Літфонд не аплачваў праезду, дый паведамленьні даслалі позна. Да апошняга моманту праўленьне арганізацыі сумнявалася ў мэтазгоднасьці сходу, на якім «пісьменьніцкі прафсаюз» мусіў вырашыць лёс эСПэшнага дому адпачынку «Іслач», што пад Ракавам.

Колісь прэстыжны, з паловы 90-х ён занядбаны. Другую зіму няма ацяпленьня, паркетную падлогу ўспучыла, страха працякае. Беллітфонд абцяжараны запазычанасьцю за «Іслач» у памеры амаль 120 млн руб. (камунальныя паслугі, заробкі пэрсаналу, аплата паліва). Рамонт не рабіўся з часу пабудовы — з 1987 г. Да ўсяго будынак вельмі энэргазатратны: кацельня стаіць далёка, патрабуецца шмат вугалю ці мазуты.

Паўтара году таму пісьменьнікі абралі старшынём праўленьня Літфонду генэрала Мікалая Чаргінца. Генэрал-дэпутат здолеў дамовіцца з падатковай аб сьпісаньні штрафу, які «вісеў» на арганізацыі, аднак канчатковага рашэньня наконт «Іслачы» няма дагэтуль.

Паколькі сход сяброў Літфонду выйшаў нелегітымны, пісьменьнікі вырашылі надаць яму рэкамэндацыйны характар. Абмяркоўваліся тры варыянты вырашэньня праблемы:

— прадаць «Іслач» і расплаціцца з пазыкамі;

— прывабіць інвэстараў і з дапамогай іх ды Міжнароднага літфонду адрамантаваць будынак;

— перадаць дом адпачынку Кіраўніцтву справаў прэзыдэнта на ўзаемавыгаднай аснове, каб атрымаць наўзамен ці Дом літаратара, ці льготныя пуцёўкі ў «Іслач», ці маёмасьць.

Першы варыянт адкінулі. Пісьменьнікі вырашылі да 1 траўня пашукаць інвэстараў, дзеля чаго даручылі праўленьню Літфонду правесьці балянсавую і рынкавую ацэнку маёмасьці. Калі ж інвэстараў ня знойдзецца, пачнуцца перамовы з Кіраўніцтвам справаў. Пісьменьнікі гатовыя саступіць 26,5 га лесу, будынак дому адпачынку, але пакінуць сабе гектар зямлі, адзін катэдж з трох і права на льготныя пуцёўкі. Нясна, якім нарматыўным актам такое права можа быць надзейна замацаванае, каб яго не скасавалі, напрыклад, праз год пасьля перадачы маёмасьці. Трэці варыянт таксама прызнае законнасьць канфіскацыі Дому літаратара, якую раней пісьменьнікі ставілі пад сумнеў.

Паводле закону, прымаць канчатковае рашэньне па «Іслачы» мае агульны сход Літфонду. Калі легітымны сход сабраць ня ўдасца, праўленьне арганізацыі дэ-факта мусіць узяць адказнасьць на сябе. «Калі мы ня вырашым гэтай праблемы, у нас проста будуць адсуджваць паціху гэтую маёмасьць», — палохае дырэктар Беллітфонду Вячаслаў Корбут. Між тым менавіта праўленьне ня здолела забясьпечыць кворум зь першай спробы.

Аркадзь Шанскі

Анатоль Клярышук

Маршруткі атакуюць

Магу адно здагадвацца, якія эмоцыі захлыналі гамельчукоў, калі на вуліцах гораду зьявіўся першы аўтамабіль. Калі паверыць газэце «Полесская жизнь» за 1911 г., значным дасягненьнем тагачаснага грамадзкага транспарту сталася выкарыстаньне трох аўто, што курсавалі між Гомелем і Беліцай. Многа ці мала? Пытаньне было рытарычным ужо ў тую часіну.

Дый цяпер пікавай часінай усе аўтобусы/тралейбусы піхма напханыя. Аплачваць праезд у такі час бальшыні здаецца залішняй сумленнасьцю: «Мы душымся тут, дык яшчэ і плаціць за гэта трэба?» Між тым дырэктарат транспартных ведамстваў пры кожнай нагодзе паўтарае пра страты з прычыны нядобрасумленнасьці пасажырства. Прыточваюць канкрэтныя лічбы-адсоткі, але не гавораць наўпрост, колькі б можна было за неатрыманыя грошыкі набыць новых машын.

Летась аўтобусьнікі і тралейбусьнікі спрабавалі ваяваць. Скасавалі штомесячны супольны праязны квіток. Купляць два розныя было накладна. Таму браўся адзін, на тралейбус. А ў аўтобусе — змушанае *зайчыкаваньне*, асабліва калі кандуктар закешкаўся і не спрыкмеціў, «хто там в міня вашол». Халодная вайна неўзабаве аціхла — вярнуўся зручны дубальтовы квіток. Толькі ж новых машынаў на маршрутах не пабольшала. То і даводзіцца чуць: «Маючы праязны «Аўтобус-тралейбус», сядаю ў маршрутку, каб безь цісканіны скоранька даехаць да працы».

Маршруткі атакуюць. Дарма што праезд у іх каштуе ў два з паловаю разы даражэй за квіток у аўтобус ці тралейбус. А каб яшчэ больш прываблівацьь кліентаў, на многіх маршрутах дзейнічае правіла: у межах пэўнага раёну (напр. Валатава, Навабеліца) аплата таньнейшая на 50%. Кіроўцы маршрутак — рызыканты-ліхачы. «15 хвілін страху, і Вы дома!» — рэклямаваў адзін такі свае паслугі. Пры найменшай мажлівасьці яны імкнуцца праехаць на чырвонае сьвятло. Пасажыр мае небясьпеку пацярпець праз прашмыгліваго вадзілу, які лічыць грошы ў часе руху, не трымаючыся за стырно. Шафёры аўтобусаў маршрутчыкаў ненавідзяць і «помсьцяць»: загароджваюць дарогу, прыціскаюць да ўзбочыны etc. Проста нейкі транспартны дарвінізм. А яшчэ ж свайго гучнага слова не пасьпеў сказаць вэлясыпэд.

Сяргей Балахонаў, Гомель

У лініі два канцы

Баранавіцкае вытворчае баваўнянае аб'яднаньне (ВБА) ўсталявала сёлета новую нямецкую лінію для вырабу высакаякаснай пражы з бавоўны. Новая прадукцыя ўжо атрымала высокую адзнаку на выставе тэкстылю ў Франкфурце. 2,5 млн эўра на закупку лініі дала дзяржава, а акупіцца абсталяваньне павінна за пяць гадоў. Калі будзе працаваць на поўную магутнасьць, перапрацоўваючы 800 т бавоўны за месяц. Аднак летась фабрыка перапрацавала за год толькі 8 тыс. тон — гэта 60% магчымасьці прадпрыемства. Дый 80% перапрацаванае прадукцыі склала давальніцкая — калі замоўца прывозіць сыравіну на перапрацоўку, а пасьля забірае.

Пража зараз будзе каштаваць таньней за расейскую, таму 300 т штомесяц згодная набываць Баранавіцкая тэкстыльная фабрыка, заціхавіліся і замежнікі. Аднак кіраўніцтва ВБА ламае галаву, за якія грошы купіць бавоўны: адзін вагон каштуе каля 70 млн рублёў. А аб'яднаньне мае вялізныя пазыкі.

Мадэрнізацыя цэху прынесла і яшчэ адну праблему. Лінія цалкам аўтаматызаваная. Пытаньне аб звальненьні паўстае перад амаль тысячай чалавек. Гэтага кіраўніцтва найбуйнейшай баранавіцкай фабрыкі пакуль не афішуе. Сярэдні заробак на аб'яднаньні адзін з найменшых у горадзе — 180 тыс. руб.

Гармата ў горадзе

У Баранавічах усталююць палявую гармату ЗІС-3 узору 1942 г. Помнік будзе прысьвечаны артылерыстам, якія бралі ўдзел у вызваленьні гораду ад фашыстаў 60 год таму. Гармату плянуецца выставіць у раёне Трацьцякоў на пустынным цяперака месцы.

У Баранавічах ужо маюцца помнікі: кіроўцам — ЗІЛ, летунам – зьнішчальнік МіГ, а таксама паравоз. Пасьля гарматы ў горадзе будзе не ставаць толькі танка.

Руслан Равяка, Баранавічы

ТБМ забясьпечыла аншляг

Нечаканы аншляг — 200 гледачоў на 170 месцаў — перажыў магілёўскі лялечны тэатар у нядзелю. Гледачы сабраліся на беларускамоўную казку «Пра дзедку Міхедку, бабку Агапку і Катка — залатога лабка» дзякуючы намаганьням энтузіястаў гарадзкой суполкі Таварыства беларускай мовы.

Зьнікненьне з рэпэртуару тэатру спэктакляў на беларускай мове адміністрацыя тлумачыла тым, што на такія спэктаклі цяжка сабраць гледачоў. Сябры ТБМ прапанавалі дапамогу ў распаўсюдзе білетаў. Адміністрацыя пагадзілася заплянаваць паказ спэктаклю на беларускай мове, пастаўленага колькі гадоў таму былым кіраўніком тэатру Алегам Жугждам, з умовай, што ўсе месцы ў залі будуць занятыя. Энтузіясты спрацавалі добра — толькі прафкам МДУ імя А.Куляшова зарэзэрваваў 40 месцаў для дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

Натхнёны посьпехам, калектыў тэатру вырашыў паўтарыць спэктакль праз месяц, 21 сакавіка. Дарэчы, у творчым набытку калектыву ёсьць яшчэ два спэктаклі на беларускай мове.

«Могилевские ведомости»

Засталіся зь Леніным

Два гады вядзецца рэканструкцыя будынку аршанскага чыгуначага вакзалу. Велічны помнік архітэктуры пачатку XX ст. стане яшчэ больш прывабным і ўтульным. Пакуль здадзеная ў эксплюатацыю заля чаканьня. Абнавіўся і вэстыбюль. Шкляныя вітражы з савецкай сымболікай, якія раней упрыгожвалі ўваходы ў будынак, замененыя на сучасныя шклопакеты. Але зусім разьвітацца зь мінулым чыгуначнікі ня здолелі. Выклікае зьдзіўленьне разьмешчаная на сьцяне вялізная, але ня вельмі ўдалая копія карціны расейскага мастака Ўладзімера Сярова «У.І.Ленін абвяшчае савецкую ўладу». Тая яе рэдакцыя, дзе Сталін ужо зарэтушаваны, але жаўнер замест яго яшчэ не намаляваны. Карціна ўзятая ў новую залацістую рамніцу.

«Нелегалы» на дарогах

Пасьля леташняй перарэгістрацыі ў Воршы працуе 225 маршрутак. Але, паводле падлікаў транспартнай інспэкцыі, на аршанскія дарогі штодня выяжджаюць 30—35 машынаў, уладальнікі якіх ня маюць ліцэнзіі. Ёсьць і такія, хто, маючы ўсе дакумэнты і дазволы, самавольна выбірае больш ажыўленыя, а праз гэта прыбытковыя маршруты. Пасажырам няма розьніцы, хто вязе, было б гэта танна, зручна ды бясьпечна. Але законапаслухмяныя кіроўцы такім становішчам не задаволеныя. Былі выпадкі, калі яны перакрывалі шлях «нелегалам» ды забіралі іх пасажыраў. Рэйды па выяўленьні парушальнікаў ладзяць сумесна падатковая, транспартная і дзяржаўтаінспэкцыі. Праўда, пра дзень аблавы «нелегалы» дазнаюцца раней і робяць сабе выходны. Лаўцам трапляюцца найбольш прагныя ды адчайныя.

Яўген Жарнасек, Ворша

Зямлі не хапае

Фэрмэры Гарадзеншчыны пастанавілі прасіць улады аб стварэньні дадатковага зямельнага фонду. Паводле слоў дырэктара Гарадзенскай абласной асацыяцыі фэрмэраў Уладзімера Вушкевіча, спэцыяльны зямельны фонд, што быў створаны раней, ужо зрасходаваў свой запас. Таму некаторыя фэрмэры ня могуць пашырыць свае гаспадаркі.

Сьвятлана Цішко, Горадня

Плён ідэалёгіі

«Пошукамі» беларускай нацыянальнай ідэі займаліся навучэнцы Баранавіцкага каледжу лёгкай прамысловасьці ў мінулую пятніцу. Падчас імпрэзы, прысьвечанай гэтаму пытаньню, адчувалася, што моладзь пачала актыўна вывучаць новы прадмет — ідэалёгію. Як засьведчыла анкетаваньне, моладзь лічыць, што Лукашэнка ўнёс у фармаваньне нацыянальнай ідэі болей за Каліноўскага ды Касьцюшку. А 178 з 300 апытаных пэўныя, што прэзыдэнт — «сымбаль, які найлепшым чынам характарызуе беларускую нацыянальную ідэю». За бульбу прагаласавуў 281 чалавек. 47% апытаных ня лічыць сябе нацыяналістамі, а 41% наагул ня ведаюць, ці патрыёты яны.

Агата Ступакова, Баранавічы

КАЛЯК АРЦЁМА ЛЯВЫ

Ён мог стаць Джорджам Першым

аднак вырашыў застацца ў гісторыі першым дэмакратычным прэзыдэнтам

22 лютага Злучаныя Штаты Амэрыкі адзначаюць сваё другое, пасьля 4 ліпеня, нацыянальнае сьвята — Дзень Вашынгтона. Імя гэта даўно стала сымбалем ЗША, але чаму так здарылася, адкажуць, мабыць, ня ўсе. З курсаў гісторыі большасьць памятае, што Вашынгтон — першы прэзыдэнт ЗША, што яго паплечнікам быў ліцьвін Касьцюшка, але гэта яшчэ не адказ. Каб знайсьці яго, трэба вярнуцца ў эпоху ўзьнікненьня амэрыканскай дзяржавы.

Другі амэрыканскі прэзыдэнт Адамс казаў: «Наша рэвалюцыя ператвараецца ў міт». Узорам такой міталёгіі зьяўляецца маналёг Янкі Здольніка: «Калісь амэрыканцы, змагаючыся з Англіяй за сваю незалежнасьць, напісалі на сваім сьцягу несьмяротныя словы: «Амэрыка для амэрыканцаў».

Насамрэч гэты лёзунг, вядомы як «дактрына Манро», зьявіўся нашмат пазьней. У эпоху Вашынгтона, асабліва ў часы яго маладосьці, слова «амэрыканец» асацыявалася найперш зь дзікуном-індзейцам. Каляністы вызначалі сябе як амэрыканскіх падданых «Яго Вялікасьці» караля Брытаніі. Сваіх ворагаў яны бачылі ў тых жа індзейцах, суседзях-французах, бунтоўных нэграх. Нават калі ўзьнікалі непаразуменьні з мэтраполіяй, ім і ў голаў не прыходзіла дамагацца разрыву зь ёй.

Біяграфія Вашынгтона даволі тыповая: багаты віргінскі плянтатар, актыўна падтрымлівае брытанскую экспансію на землі індзейцаў і французаў, вядзе гандлёвыя справы з ангельскімі фірмамі — зь іншымі і не дазвалялася. Палітычнае яго крэда ў той час: «Незалежнасьці ня хоча ніводзін разумны чалавек па абодва бакі акіяну».

Аднак поўнай згоды ўсё ж не было. Каляністы хацелі прадстаўніцтва ў брытанскім парлямэнце, пратэставалі супраць абкладаньня калёніі падаткамі бязь іх згоды, большых магчымасьцяў для камэрцыйнай дзейнасьці.

Лёндан лічыў гэта бунтам і адказваў пагрозамі й рэпрэсіямі. Тым ня менш амэрыканскія лідэры ўсяляк падкрэсьлівалі сваю лояльнасьць гістарычнай маці-Радзіме. І калі зьявіўся памфлет Томаса Пэйна «Здаровы сэнс», дзе ўпершыню было абвешчана, што Англія больш ня маці-Радзіма для Амэрыкі і трэба стаць на шлях барацьбы зь ёй, амэрыканцаў гэта напалохала. Толькі

> Незалежнасьць спачатку палохала амэрыканцаў. У Нью-Ёрку нават прынялі Дэклярацыю залежнасьці. Але Англія перастала быць маці-радзімай для амэрыканцаў. А выйсьце знайшлося ў дактрыне нэўтралітэту: «Ніякіх саюзаў з абавязкамі».

Вашынгтон адкрыта падтрымаў Пэйна, дарэчы ангельца, і прымусіў амэрыканскі кангрэс прыняць знакамітую Дэклярацыю Незалежнасьці.

Лояльны падданы, тыповы плянтатар-каляніст ператвараўся ў бацьку-заснавальніка нацыі. Але Дэклярацыю Незалежнасьці яшчэ трэба было ажыцьцявіць. Каляністам супрацьстаяла наймацнейшая дзяржава Эўропы, а іх войска ня мела нават амуніцыі. Ангельскія салдаты называлі амэрыканцаў «бясштаньнікамі». Нядзіва, што шмат хто лічыў самым бясьпечным заставацца на пазыцыі адданасьці каралю — лялізму. У Нью-Ёрку нават прынялі Дэклярацыю залежнасьці.

Трэ было стварыць баяздольнае войска, жорстка душыць усялякую здраду, каб знайсьці падтрымку супернікаў Вялікай Брытаніі ды ўрэшце перамагчы. Вашынгтон прызначаны камандуючым арміяй Кангрэсу. Хоць баёў паўстанцы больш прайгравалі, чым выйгравалі, хоць тыповай зьявай была здрада, у тым ліку вышэйшых чыноў, але, паводле Вэрсальскага замірэньня 1783 г., ангельцы вымушаныя былі прызнаць амэрыканскую незалежнасьць.

Атрымаўшы перамогу, узнагародзіўшы сваіх паплечнікаў, сярод якіх быў і Касьцюшка, Вашынгтон лічыць, што сваю справу зрабіў. Ён хоча вярнуцца дадому, але суайчыньнікі не адпускаюць яго. Хутка Вашынгтону прыходзіць ліст ад групы афіцэраў, дзе выказваецца думка, што Амэрыка «можа існаваць толькі ў выглядзе абсалютнай манархіі». А бацькам нацыі павінен быць Джордж Першы. Рэакцыя Вашынгтона была недвухсэнсоўная: ён ня ведае, гаварылася ў адказе, што магло навесьці на думку, быццам можна пагадзіцца на такую прапанову, і просіць больш яго не турбаваць. Нават сучасьнікам такая адмова ад улады бачылася чымсьці выключным. Правадыры вызваленчых рухаў лёгка робяцца дыктатарамі, таму ўчынак Вашынгтона паўстае прыкладам амаль непераўзыдзенага высакародзтва. Магчыма, у ім ключ да адказу на пытаньне, чаму ў Паўночнай Амэрыцы, у адрозьненьне ад Паўднёвай, ніколі не было ваенных пераваротаў, бясконцых «віяленсіяў».

Адчапіцца ад улады, аднак, не ўдалося. Дэвізам першай прэзыдэнцкай кампаніі ў ЗША стаў: «Вашынгтона — у прэзыдэнты». Іншага кандыдата папросту не знайшлося.

Прэзыдэнцтва, аднак, ня стала для старога плянтатара шчасьцем.

WWW.ARTUNFRAMED.COM

Звыклы да замкнёнага ладу жыцьця, ён зь цяжкасьцю пераносіў афіцыйныя ўрачыстасьці, а яго імі яшчэ папракалі: маўляў, надта нагадвае каралеўскі двор. Былыя паплечнікі Томас Джэфэрсан і Аляксандар Гамільтан варагавалі, і кожны апляваў да прэзыдэнта. Няпроста было арыентавацца і ў замежнай палітыцы. З кім сябраваць — з былой мэтраполіяй, яшчэ нядаўна варожай, але ўсё ж роднай па культуры і крыві, або з Францыяй — яна дапамагала ў вайну, але чаго чакаць ад яе пасьля Рэвалюцыі? Выйсьце Вашынгтон знаходзіць у дактрыне нэўтралітэту: «Ніякіх саюзаў з абавязкамі». Гэты прынцып стаў палітычным запаветам Вашынгтона і вызначаў замежную палітыку дзяржавы да Пёрл-Харбару.

У адрозьненьне ад большасьці наступнікаў, першы прэзыдэнт ня стаў дамагацца пераабраньня на другі тэрмін і апошнія гады правёў у сваім маёнтку. У тэстамэнце Вашынгтон адпускаў на волю сваіх рабоў і выказваў надзею, што з часам рабства зьнікне зусім. Падараваўшы такім чынам сваё імя будучым абаліцыяністам, ён заклаў яшчэ адзін падмурак свабоды сваёй краіны.

Усяслаў Шатэрнік

Ахоўнікі нафты

Захад быў Франкенштайнам, які з розных рэлігійных, этнічных супольнасьцяў стварыў монстра пад назвай «Ірак».

Дыктатары — заўсёды паразыты на целе сваёй краіны. Ня толькі таму, што высмоктваюць яе чалавечыя і матэрыяльныя рэсурсы. Гэта навідавоку. Галоўная функцыя дыктатараў — падмяняць сабой краіну, яе народ, гісторыю, культуру, рэлігію. І самае прыкрае, што часам мы самі пачынаем верыць чарговаму: «Краіна — гэта я». Іракскі выпадак — найбольш яскравы прыклад такога.

Яшчэ год таму пісаць пра Ірак значыла пісаць пра Садама. Вакол яго асобы будавалася большасьць прагнозаў. Ці то народ будзе змагацца да апошняга за Садама? Ці то, як толькі Садама зловяць, супраціў спыніцца? Ніводзін з тых прагнозаў ня спраўдзіўся. Чаму? Вельмі проста. Ірак — гэта не Садам. Цяпер, калі Садам, незалежна ад яго далейшага лёсу, стаў прыватнай асобай, надышоў час паспрабаваць заразумець Ірак безь яго.

Вытокі сучаснага Іраку — не ў Бабілёне. Згадаем, зь якім імпэтам мясцовы люд расьцягваў рэшткі старажытнага гораду пасьля зрынаньня Садама. У сваіх сучасных межах Ірак быў створаны Вялікай Брытаніяй у 1920 г., пасьля распаду Асманскай імпэрыі, зь яе былых правінцый. Таму пытаньне аб праве заходняга ўмяшальніцтва тут рытарычнае. Захад быў тым Франкенштайнам, які з розных рэлігійных, этнічных супольнасьцяў стварыў монстра пад назвай «Ірак». І той да сёньняшняга дня не дае спакою свайму стваральніку. Шыіты, суніты, курды, а яшчэ асырыйцы, туркмэны — усе яны былі сьцягнутыя, каб ахоўваць брытанскую нафту. Ніводная з названых групаў (а гэта толькі самыя значныя) не лічыла новую дзяржаву сваёй. Караля давялося везьці з-за мяжы. На трон быў пасаджаны прадстаўнік роду Мухамэд з Хашымітаў Фэйсал, які называў сваіх падданых «зграяй кланаў, пазбаўленых усялякага ўяўленьня пра патрыятызм».

Ні сьвятасьць дынастыі, ні дэмакратычная канстытуцыя, напісаная ў Лёндане, не маглі інтэграваць гэтую масу ў адзінае цэлае. Ужо ў 1920 г. паўсталі шыіты. Да 1926 г. супраціўляліся далучэньню да Багдаду курды, у 1933-м адбылася страшэнная разьня асырыйцаў, якія таксама марылі аб сваёй дзяржаве.

Захад рабіў стаўку на моцную асобу. Спачатку гэта быў кароль Фэйсал, потым — іракі «жалезны канцлер» Нуры Саід. Такую мянушку апошні атрымаў нездарма: трымаў у руках сыноў Фэйсала, пераможыў не адну спробу перавароту, дзеля аховы брытанскіх інтарэсаў забараняў партыі, газэты, расстрэльваў камуністаў. Садаму было ў каго вучыцца. Але і Нуры Саіду прыйшоў канец. Яго зьліквідавала рэвалюцыя 1958 г.

Вайскоўцы, якія ўзялі ўладу, ня ведалі, што ім рабіць з краінай, і даволі хутка зьляцелі.

Садам меў сваё ўяўленьне аб лёсе Іраку. Ён спрабаваў адрадзіць яго гістарычную памяць, даць мінулае і надзею на будучыню, дзеля чаго рэканструяваў Бабілён. Фактычна гэта была яго велізарная прыватная калекцыя, таму, рабуючы яе, народ разьвітваўся з садамаўскай эпохай. Хусэйн узяў у свае рукі нафту. Але і для Садама Ірак ня быў самамэтай, а хутчэй шляхам да ўлады ў рэгіёне.

Сёньня сытуацыя такая ж, здаецца, як 80 гадоў таму. Ізноў жыхарам Іраку вязуць дэмакратыю і кіраўнікоў з-за мяжы, зганяючы ўсіх вакол Багдаду, не пытаючы, хочуць яны таго ці не. Як і раней, на першым месцы ў Захаду нафта, а ня людзі. І калі так пойдзе далей, магчымыя два фіналы: ці нафце зноў знойдуць ахоўніка ў выглядзе новага Садама, ці нафтавы картэль «Ірак» усё ж такі распадзецца. Што адбудзецца?

Адказу не давядзецца доўга чакаць. Яго ведаў яшчэ стары Ксэнафан, калі запісаў наступныя словы: «Не ад пачатку багі ўсё сьмяротным адкрылі, Толькі праз час мы найлепшае (у пошуках) знойдзем».

Вацлаў Шаблінскі

Сьвята трох каралёў

Да Вольскага, Міхалка ды Кулінковіча далучыцца Алег Скрыпка

«Панаехала гасьцей з іншаземных абласьцей», — гэтыя словы сьпяваюць усе, ад маленькіх дзяцей да ўкраінскіх мытнікаў. Лікёры з «крамбамбульнай» дылёгіі — куантро і брамбуе, не мінаючы й самой крамбамбулі, — б'юць рэкорды продажаў, нягледзячы на сваю завоблачную цану. Сам музычны праект зьбірае пад свае сьцягі ўсё больш люду. Спачатку да Лявона Вольскага далучыліся Сяргей Міхалок і Аляксандар Кулінковіч, пасьля зьявіліся опэрныя пяюльлі й балерыны. А хутка ў гэтую кумпанію трапіць і Алег Скрыпка з «Вопляў Відаплясава».

Шмат хто з айчынных выканаўцаў распрацоўваў тэму культуры піцца «ад панядзелка да панядзелка». Асаблівых посьпехаў у паэтызацыі чаркі ды куфля дасягнула «Крама». У рэпэртуары гурту і «Выпі са мной да дна», і «Карчма», і «Гэй, там, налівай». У параўнаньні з гэтым разнаквецьцем песьняроўская «Чарачка» ці ўлісаўскі «Добры напой» глядзеліся бледнавата.

Канкурэнтаў не было, пакуль Вольскі ня вымудрыў «альбому-канцэпту» зь песьнямі, стылізаванымі пад музыку краінаў, дзе пануе той ці іншы напой. Так на мяжы стагодзьдзяў паўстала «Крамбамбуля» — энцыкляпэдыя адначасова алькагольная і музычна-стылёвая. Ледзьве яна зьявілася, як журналісты залямантавалі пра «апапсеньне» — у некаторых гэтае слова сынанімічнае «заняпаду» — рокзоркі. Асабліва Лявону калолі ў вочы песьняю «Я — рок-музыкант», дзе зусім яшчэ юны лідэр «Мроі» маніфэставаў: «Я не люблю салодкіх сьпеваў і песень рэстаранны варыянт». На ўсе закіды пасталелы Лявон адказваў ляканічна: «Час паказаў, што рок-музы́ка можа сабе дазволіць заходзіць на тэрыторыю папсы, кпіць з рок-му́зыкі ды з самога сябе. А песьні кшталту «Рок-музыканта» былі праявамі юнацкага максымалізму».

«Добры музыкант без праблемаў зробіць папсовы шлягер, і зробіць гэта лепей за тых, хто працуе толькі ў поп-індустрыі», — падтрымліваў калегу Піт Паўлаў. Толькі вось нешта не даходзілі раней рукі ў нашых музычных талентаў да стварэньня простых твораў. Таму папса была другасная, адсталая ды неканкурэнтаздольная. «Крамбамбуля» ж з «Абсэнтам» ды «Гасьцямі» зайшла ў кожны дом. Яе ўспрынялі незалежнікі — таму што на роднай мове і якасна. Яе ўспрынялі саветчыкі — бо нешта ёсьць у гэтым ад «Песень пра галоўнае», толькі па-наску. Ня больш чым музыка для адпачынку зь лёгкімі і сьмешнымі тэкстамі, без палітыкі і глябальных праблемаў. А адпачываць хто ня любіць? «Крамбамбуля» прыйшлася дарэчы.

Над капейкай ня трэсьліся

«Крамбамбуля» — гэта вялікая правакацыя, эпатажнае відовішча, музычная машына, што едзе насуперак усім правілам і стэрэатыпам айчыннага шоў-бізнэсу. Найперш была парушаная традыцыя «малабюджэтнасьці»: прадусары, не шкадуючы сілаў, шукалі грошай на раскрутку праекту. Колькі дакладна ўклалі ў «Крамбамбулю» — ніхто не прызнаецца. Але чаго вартая адна прэс-канфэрэнцыя ў рэстарацыі «Печкі-лавачкі», дзе можна было пакаштаваць усе напоі, пра якія сьпявае Вольскі ў «Застольным альбоме». Ці кастрычніцкае шоў з салісткай Опэры, балерынамі, танцавальнымі парамі. Як кажа прадусарка Ганна Вольская, «грошы пайшлі вялікія». Але выдаткі акупіліся: па выніках продажаў дыскаў беларускіх выканаўцаў у музычных крамах «Містэрыя гуку», першая «Крамбамбуля» заняла трэцяе месца, «Каралі раёну» — другое. Першае, зразумела, «Дом культуры» «NRM».

Ушчэнт быў разьбіты «Крамбамбуляй» і стэрэатып наконт непадступнасьці ТВ і FM для беларускай музыкі. Задоўга да вядомай пастановы пра 50% напаўненьня радыёэтэру «Абсэнт» круціўся напоўніцу амаль на ўсіх FM-станцыях. Кліп на гэтую песьню трымаўся з год у лідэрах «Кліп-абоймы», цяпер «Госьці» знаходзяцца ў жорсткай ратацыі Першага музычнага каналу. Ахвотна ставяць «Гасьцей» і на ўкраінскай ТВ. Паводле словаў аднаго з прадусараў праекту Віталя Драздова, сёньня іх сьпявае ледзь не палова Ўкраіны. Нават супрацоўнікі мытні сустракаюць беларусаў словамі: «Панаехала гасьцей...»

Украінізацыя «Крамбамбулі» на гэтым ня спыніцца. Ужо вядома дакладна, што да «мясцовых аўтарытэтаў» — Вольскага, Міхалка ды Кулінковіча — хутка далучыцца кароль суседняга раёну Алег Скрыпка. Ён засьпявае зь Лявонам песьню «Суседзі» адмыслова для ўкраінскага выданьня «Крамбамбулі». Будзе й кліп. Дыск мае выйсьці на самым буйным украінскім лэйбле «Lavina Records», што выдаваў альбомы «Вопляў Відаплясава» ды «Акіяну Эльзы».

Будзе песьня пра жэншчын

Гурт «Крамбамбуля» абяцае запісаць яшчэ два дыскі з абсалютна новымі песьнямі. Першы станецца своеасаблівым працягам «Застольнага альбому» й будзе прысьвечаны дасьледаваньню геаграфічна-алькагольнага калярыту экзатычных краінаў Усходу. Апроч таго, ня спыніцца й прапаганда старадаўняга беларускага напою ды айчыннай музыкі ў суседніх краінах. Так што магчымая супраца з польскімі й расейскімі музыкамі.

Ідэю яшчэ адной новай праграмы — «Крамбамбулі сьвяточнай» — падкінуў Міхал Анемпадыстаў, аўтар «Народнага альбому». Кожная песьня там будзе прымеркаваная да якога-небудзь сьвята: ці то традыцыйнага і сур'ёзнага, кшталту Калядаў або Купальля, ці то досыць легкадумнага — як Дзень танкіста або міліцыі. «Дваццаць трэцяга феўраля паздраўленія прымаю я», — прадэклямаваў Вольскі словы з адной такой «сьвяткавалкі». Яшчэ больш трасяначнай, відаць, будзе песьня «Дарагія жэншчыны»… Абы суседзі ўсур'ёз не палічылі гэта за беларускую мову…

Крамбамбульныя каралі маюць што сказаць. Дык чакайце ў госьці іх. Найбліжэйшае рандэву — у к/з «Менск» 4 сакавіка. Канцэрт захавае ўсе разынкі кастрычніцкага шоў. Будзе й колькі сюрпрызаў, як, напрыклад, прэзэнтацыя новай удзельніцы праекту з «азіяцкім калярытам», пошук якой вядзецца праз прэсу... А той, хто не пашкадуе на квіток 35 тыс. руб., атрымае шанец павячэраць у рэстарацыі. У кампаніі трох каралёў.

Сяргей Будкін

Сяргей Міхалок:

Мне трасянка смачная

А калдырыцца я ня буду

«Ляпіс Трубяцкой» зьвіў сабе гнязьдзечка ў былым дзіцячым садку ля плошчы Прытыцкага — у раёне не старым, але абжытым. Справа ад ляпісаўскага садка — пункт прыёму шклатары й элітны салён прыгажосьці (у адным будынку). Зьлева, за якія пару мэтраў, — апарняк міліцыі. Дабрэнныя дзядзькі ў форме са сьмешкамі й пацешкамі назіраюць за пляшачнай мафіяй. Жыцьцё кіпіць і на вачох нараджае гарадзкі фальклёр. Мабыць, хлопцы пачуваюцца тут зусім утульна.

«НН»: Заўважна, што Вы інтэлігентны чалавек і ня любіце хамства, але паважаеце гарадзкі фальклёр, дваровую культуру. Як гэта можна спалучаць?

С.М.: Мая «інтэлігентнасьць» пакрыўленая. Сярод маіх літаратурных жарсьцяў — інтэлектуалы з паўкрымінальным, напаўалькагалічным налётам — Марцін Эміс, Уладзімер Букоўскі, Сяргей Даўлатаў. Я не з рафінаваных хлопчыкаў, якія ранкам беглі ў музшколу. Я ведаю, што такое двор. Мы ўмелі за сябе пастаяць пад націскам гапаты і ў тусоўках ля «Пінгвіну», і ў іншых пажыўных месцайках. Я не чалавек, які церпіць хамства ў адносінах да сябе, і не чалавек, які ня будзе біцца. І сябры мае такія ж — я называў іх раней агрэсіўна-піяцкі бамонд. Гэта разумныя людзі, якія без асаблівай складанасьці арыентуюцца ў культуры — тэатры, музыцы, літаратуры. Але яны арыентуюцца і ў іншым баку жыцьця. Дваровая культура вельмі важная для мяне. Гарадзкі фальклёр вельмі важны. Я не разумею людзей, якія лаюць гарадзкі фальклёр і цягнуцца толькі да вясковай аўтэнтыкі. Я з пакаленьня, якое памятае дваровыя песьні й ведае кодэкс гонару: калі ідзеш чвыіху праводзіць, цябе не зачэпяць, а вось як будзеш брысьці назад, тут ужо не наракай… Альбо ў школу ў падлу было ісьці ў новых чаравіках, трэ было іх абшаркаць адзін аб адзін. Або крута было запальваць запалкі аб трэнікі, аб бядро. Кожны пацан знаў, як сябе паводзіць, як размаўляць, што сьпяваць. У дзяцінстве было «Самалёт, самалёт, забяры мяне ў палёт, а ў палёце пуста, вырасла капуста». Рэальная абсурдысцкая песенька. Глябальная такая. Потым юнацкі фальклёр з матам… Горад жыў сваім жыцьцём, ня зьвязаным з афіцыйнай культурай, з палітыкай. Гэтыя дробязі для мяне цікавыя, але я пакрываю іх пацінай гумару і не спрабую паказаць паўкрымінальнае жыцьцё крутым і прывабным. Хоць бандыты мяне слухаюць.

«НН»: Сьведчу, што міліцыянты таксама.

С.М.: Не зразумець, хто болей. Мне падабаецца гэтая дыфузія ў жыцьці, гэтае некарпаратыўнае дачыненьне. Для мяне гэта сур'ёзная жыцьцёвая камунікацыя. Людзі ня могуць існаваць кожны ў сваёй фармацыі ці групе — музычнай, клясавай, рэлігійнай. Гэта было б нецікава.

Працяг на старонцы 13.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

8

А Пане Каханку
Спаткаўся з русалкай,
І вынікам шлюбу
Былі селядцы.

На ўсходзе Расея
Ізноў вар'яцее.
Эўропу заносіць
То ўлева, то ўправа.
А Пане Каханку
Ня піў валяр'янку,
А піў крамбамбулю
Пад смачныя стравы.
Вось так і праходзяць
Гады ды стагодзьдзі,
Зьнікаюць народы,
Сады і гароды,
А Пане Каханку
Нам блізкі і родны,
І кожны быць хоча
Да пана падобным.

C
І кожны з нас хоча
G
Пажыць у палацы
D
І мёдам і крупнікам
G
Пачаставацца.

9

Нам гарэлкі будзе мала

Am
Гэй, рамалы, што вы, дзе вы?
Пачынайце вашы сьлёвы
Пра жыцьцё, пра сьмерць, пра грошы,
E
Пра цэлы сьвет.
Льецца песьня ў нашы душы,
Хто быў слабы, будзе дужы.
Хто быў скваэтны, будзе шчодры, —
Am
Зьменяцца ўсе.

Пачынайце сьлёў, рамалы,
Нам гарэлкі будзе мала,
Мы нальем яшчэ сабе
Пякучы напой.
Заблішчыць сьляза на вейцы,
Хочаш плач, а хочаш — сьмейся,
Песьня ды гарэлка льецца, —
Вып'ем з табой!

Вып'ем раз і вып'ем дзесяць.
Хай ярчэй нам сонца сьвеціць!
Хай разтоніць вецер сьмецьце
З чыстай душы!
Засьпяваем, засьпяваем,
Аддамо усё, што маем,

16

Дзесяць песень

«Крамбамбулі»

Прыпеў:

Есьлі хто-та ўдруг пра вас
Гаварыт плахое,
Мы даддзім яму атпор,
Нанясём пабоі.

Есьлі страшна будзе вам
Выйці із трамвая,
То мужчына падайдзёт
І руку працянет.

Прыпеў:

Дарагія жэншчыны, мы жылаем вам,
Каб мужчыны падалі к вашым нагам,
Каб была бальшая, крэпкая сямья,
Каб былі няп'юшчыя верныя муж'я.
Каб у 45 і дажа ў 75 —
Усягда вы былі ягадкі апяць.

Дарагія, помніце:
ў час таскі пячальнай
Мы маральна вас паддзержым
І мацерыяльна.

Помнім мы а вас всягда,
А ня мэджду прочым.
І прыдзём на помач вам
Утрам, днём і ноччу.

Што ж, чакайце ў госьці нас

Месца для аўтографаў

4

Dm G
Мігціць напераддзе растаньне,
Dm G
І сьвечка на стале згасае...

Прыпеў:
C
Учора ці сёньня,
Яшчэ ці ужо...
Am
Растуць парасоны
Пад цёплым дажджом.
Dm
Усё летуценна,
G
І веры няма сабе.
C
Усё нерэальна,
Нібыта у сьне:
Am
Начная кавярня,
Агні у акне,
Dm
І водар растаньня,
G
Палынны напой —

C G
абсэнт.

5

Усё ў жыцьці не назаўжды:
Праходзяць летнія дажджы,
Усё мінае, усё зьнікае,
Тугою зьменіцца каханьне.

Прыпеў.

Французы кажуць: c'est la vie.
Я буду жыць, і ты жыві.
Запомнім мы кавярню гэту
І пах растаньня і абсэнту.

Куфаль піва, келіх віскі

D A
Куфаль піва, келіх віскі налівай хутчэй,
D A
Куфаль піва, келіх віскі паўтары яшчэ!
D G
Так казаў Крывавы Білі, так казаў штодзень.
D A D
Маё піва, маё віскі дзе?

Не выходзіў ён з салуну і ў касьцёл ня йшоў.
З раніцы ён пачынаў сваё пьяное шоў:
Куфаль піва, келіх віскі налівай хутчэй!
Піва, віскі паўтары яшчэ!

12

Работа

Дзяўчына працавала
Ў сталоўцы №3.
Біточкі гатавала
Да позьняе пары,
Бацюня быў п'янтосам,
А мамкі не было.
Вось так, зусім няпроста,
Жыцьцё яе ішло.

Прыпеў:
Дзень у дзень,
Дзень у дзень,
З году ў год —
Работа, работа,
А сэрца, нібы самалёт,
Так прагне палёту.

І неяк у сталоўку
Зайшоў адзін салдат.
Прабіў сабе пярлоўку
І зь селядцом салат.
Убачыў ён дзяўчыну,
І ежа не пайшла.
Працяла яго сэрца
Амурава страла.

Прыпеў.

13

На першае спатканьне
Яны пайшлі ў музэй.
Ён так быў закаханы,
Што кінуў нюхаць клей,
Але загад прыходзіць:
Салдату — на Каўказ.
Ня плач, мая дзяўчына,
Не прападзе спацназ!

Дзяўчына ў перазьменку
Па горадзе ішла.
Героя ў камуфляжы
Убачыла яна.
Вярнуўся ён з Каўказу
І курагі прывёз.
Жыцьцё пайшло адразу
Бяз гора і бязь сьлёз.

Прыпеў:
Дзень у дзень,
Дзень у дзень,
З году ў год —
Каханьне і згода,
І сэрца шчасьлівы палёт
Ужо назаўсёды.

Няма

Дзе жа ты, маё каханьне?
Дзе жа ты, мая любоў?

Госьці

Am
Панаехала гасьцей
C G
З іншаземных абласьцей...
Dm
Не! Няправільна: гасьцёў
E Am
З іншаземных абласьцёў.
Вось прыехалі усе —
Містэр, пані, гер, месьє...
Сі, сэньёра, ўі, мадам,
Прахадзіце, гаспада!
Вось прыехалі яны —
І паненкі, і паны —
Ў край суворых катаклізмаў
Са сваіх капіталізмаў.

Прыпеў:
Am
Госьці, госьці, госьці,
F
Хтосьці ёсьць, няма кагосьці.
G
Госьці, госьці, госьці,
Dm
Хтосьці з кімсьці дзесьці штосьці...

Павяліі тады мужчынаў

2

Дарагія жэншчыны

Дарагія жэнчычыны,
Мы вас паздраўляем!
І за празьнічным сталом
Мы вас праслаўляем.
Дарагія жэнчычыны,
Унываць ня нада,
Бо надзёжная рука
Будзе з вамі радам.

Есьлі ўдруг халодным ветрам
Задышала осень,
То мужчына свой пінжак
На плечы вам набросіт.

Есьлі ўдруг каблук сламаўся,
Дарагія нашы,
То мужчыны на руках
Панясуць вас дальша.

Хадзіў ён, хістаўся, па цьвёрдай зямлі,
Нібыта па хісткім дзе караблі,
А мора ня бачыў, гарэла душа,
І ромам тушыў ён душэўны пажар. } *2 р.*

Вось так і скнаў між азёраў і рэк
Тутэйшы, але ўжо марскі чалавек.
Ляжыць у сваёй беларускай зямлі
Ў драўляным апошнім сваім караблі. } *2 р.*

5

7

Піў крамбамбулю
Em D
За шклянкаю шклянку.
G
І крупнік, і зьбіцень
D
Ліліся штотыдзень
Магутнай ракою,
G G7
Як Нёман-рака.
C
Ішла пагулянка
G
Ад ранку да ранку,
І куфлі ўздымала
G H
Каханку рука.

Але пагулянка
Народ не дзівіла,
Бо Пане Каханку
Быў Радзівілам,
Бо быў ён магнатам,
Магнатам багатым,
Магнатам вядомым
У сьвеце і дома.
Быў сьвет неспакойны —
Паморкі ды войны.
Вялікага Княства
Мінулі часы.

10

У руках не затрымаем
Грошы — грашы.

Тым, каго мы моцна любім,
Анічога не шкадуем,
І апошнюю кашулю
Здымем зь сябе.
Налівай паўней кілішкі!
Выпіць сёньня нам ня лішне,
Ну, а заўтра мы па-інша-
му зажывем.

Hm
Эх, жыцьцёвая дарога!
Шчасьця шмат і гора многа.
Будзе радасьць і трывога,
F#
Будзе любоў!
Хай жа будзе ўсё, што будзе,
Хай дыхнуць свабодай грудзі,
Хай ня будуць душы ў брудзе
Hm
Нашы з табой.

Люблю

Я вас люблю,
Любоў яшчэ
Ў душы пагасла не вапшчэ,
І апрач вас яшчэ люблю
Ваду, і неба, і зямлю.

Garson, віна!
Я не люблю, калі вайна,
Але люблю, калі вясна
І восень, лета і зіма.

Люблю лясы і гарады,
Азёрны бераг залаты,
Люблю начную магістраль
І польку, вальс і пастараль.

Люблю, калі
Сады квітнеюць і палі,
Люблю хадзіць, люблю сядзець,
Ляжаць і ў нікуды глядзець.

Люблю я дзень, люблю я ноч,
Люблю я сьнег, люблю я дождж,
Калі мяце, калі пяча,
І шмат чаго люблю яшчэ.

Люблю усё,
Што называецца «жыцьцё».
І песьню гэтую пяю
Пра тое, што жыцьцё люблю.

11

Марскі чалавек

І рэк, і азёраў мы маем зашмат,
А мораў няма, акіянаў няма.
Па мне дык нічога, а быў чалавек,
Што з гэтай прычыны законны свой век. } *2 р.*

Ён тут нарадзіўся, і вырас ён тут,
Але ў карабельны пайшоў інстытут,
Усе акіяны і моры скарыў,
І вось на радзіму вярнуўся, стары.

Дзе спатканьні, дзе прызнаньні *2 р.*
Між таполяў і дубоў?

Прыпеў:
Няма. Няма. Няма.

Дзе жа ты, мая зязюля?
Дзе сьвятло маёй душы?
Я нарваў табе лубінаў, *2 р.*
Да мяне хутчэй бяжы!

Прыпеў.

Запалю сваю лучыну,
Ўзяў цымбалы напракат.
Дзе ж ты, дзе, мая дзяўчына, *2 р.*
Дзе пяшчотны твой пагляд?

14

Мы ў музэй вайны айчыннай,
Павяліі тады жанчынаў
Мы на каву капучына.
Ўсе па-розному балбочуць,
Капучыны піць ня хочуць,
А з музэю госьці ўпотай
Зьнесьлі пару кулямётаў.
Кажуць: гэта нам карысна
У змаганьні з глябалізмам,
А яшчэ карысна нам
Самагонкі па сто грам.

Прыпеў.

Любяць госьці самагонку,
Маюць густ даволі тонкі,
Бо тэкіла, ром і віскі —
Гэта ўсё па-глябаліську.
...Вось разьвіваецца ўжо час.
Што ж, чакайце ў госьці нас,
І рыхтуйце там свае
Куантро і брамбуе.

Прыпеў.

Абсэнт

C Am
Pardon, je ne parle pas francais.
C Am
Кавярня, прыцемкі, абсэнт...

3

Неяк хлопцы у салуне пачалі страляць
Білі ў гэтай стралянне стрэлілі хлопцаў зь пяць.
Засудзілі потым Білі, павялі каразь,
Не далі у покер дагуляць.

І, намыліўшы вяроўку, запытаў шэрыф:
Што жадаеш перад сьмерцю, Білі, гавары!
— Куфаль піва, келіх віскі мне налі, шэрыф,
Потым піва, віскі паўтары.

Наліваілі, паўтаралі Білі і сабе,
І пападалі, паснулі, захраплі усе.
І адзін Крываваы Білі хрыпла ўсё крычэў:
— Піва, віскі паўтарыць яшчэ!

Пане Каханку

H Em
Гарэлі усходы,
H
Палалі заходы,
Пакутаваілі людзі
Em E7
Ад цяжкай работы,
Am
А Пане Каханку
Em
Ад ранку да ранку
H

Тытры, як пры немцах

Калі ўключаю БТ, дзе навіны перадаюць за дзень аж чатырнаццаць разоў і ўсё па-расейску, адчуваньне такое, быццам трапіў у разанскую ці кастрамскую глыбінку. Памятаю, вясной 1942 г. зь сябрам (нам было тады па пятнаццаць) мы хадзілі пешшу ў Слуцак за 20 кілямэтраў, паглядзець кіно ва ўцалелым ад бамбёжак кінатэатры «Чырвоная зорка». На экране сьпярша дэманстравалася дакумэнтальная хроніка «Вафэн-шоў», дзе паказвалі эпізоды баёў, а затым ішла нямецкая кінакамэдыя. Што запомнілася, дык гэта тытры на беларускай мове ўнізе экрану. Яны перадавалі ўсё, што гаварылі героі фільму і дыктар «Вафэн-шоў».

А сёньня ў незалежнай дзяржаве нам праз самы масавы і ўплывовы сродак агітацыі навязалі сілком расейскую мову. А гледачам падкінулі вартыя жалю тытры. Цешцеся, браткі-беларусы! І калі мы так абыякава будзем ставіцца да выцясьненьня з ужытку роднай мовы, нас чакае асыміляцыя. Сьведчаньне чарговае таму — зьнікненьне з продажу ў газэтных шапіках гораду газэты «Наша слова». Аблсаюздрук даў каманду не завозіць: маўляў, не раскупляецца. Яшчэ добра, што падпісчыкі пакуль маюць магчымасьць атрымліваць газэту.

Міхась Кутнявецкі, Слуцак

Халадушка

На пачатку 60-х я падлеткам пабываў у гасьцях у сваёй цёткі ў горадзе Пенза ў Расеі. У адзін сьпякотны дзень вялікай кампаніяй паехалі на адпачынак на лясное возера. Вада была вельмі цёплай, а паветра — бы ў печы. Таму нехта са сваякоў цёткі прапанаваў прайсьціся ў вёску папіць малака.

Я далучыўся. Гаспадыня хаты спытала, хто якое хоча малако — «с холодушкой или без?» Паколькі я не зразумеў, што такое «холодушка», то адзіны папрасіў без. А цётка за кампанію зь мясцовымі згадзілася «с холодушкой».

Ёй падалі малако ў вялікім гліняным збане. Пачала піць, але раптам бразнула яго аб падлогу і кінулася з хаты прэч. На падлозе ў лужыне малака, сярод кавалкаў збана, нязграбна варушыла лапкамі вялізная рабая жаба, якая не магла паўзьці, таму што не дакраналася імі падлогі праз сваю таўшчыню.

Гаспадыня пачала тлумачыць, што жаба чыстая, жыве толькі ў малацэ, каб яно было халодным і доўга не скісала. Мясцовыя ёй адказалі, што



цётка нядаўна прыехала ў Пензу зь Беларусі і яшчэ ня ведае ўсіх звычаяў.

Прыйшлося плаціць за малако і збан, а я, нягледзячы на тлумачэньні, кінуўся за цёткай... Потым яна растлумачыла свой учынак — калі пачала піць, жаба палезла з малака ёй у твар.

Заўсёды ўспамінаю слова «холодушка», калі хто-небудзь «свысока» кажа аб вядомай нацыі зь вядомай прычыны — «лягушатники». Але мала хто верыць. Спрабаваў знайсьці доказы гэтаму звычаю, перагартаў усе расейскія энцыкляпэдыі ды тлумачальныя слоўнікі — дарэмна.

Спадзяюся, што гэтае маё апавяданьне дапаможа ўзбагаціць «великий и могучий».

Хвёдар Пінчук, Менск

Сьлед на сьнезе

Вечар. Вяртаюся з працы. Прыпынак ля «Белай вежы». Вялікая гурба, вышынёй зь мяне. Амаль бялюткая: далёка ад дарогі для аўтамабіляў. Але ня чыстая — запляваная шалупіньнем семак і сям-там недапалкамі. На самым версе, на ўзроўні маіх вачэй, — адбітак жаночага (ці дзіцячага) абутка. Лёгенька так прыціснулі, каб абазначыць сваю прысутнасьць. «Тут быў я» па-зімовому. Падымаю вочы вышэй. Цёмнае неба і сьвет ліхтароў. Вочы стаміліся дванаццаць гадзінаў запар глядзець у манітор. Вушы такса стаміліся, бо прасядзеў паўдня ў слухаўках. Зато цяпер машыны пралятаюць міма зусім бязгучна, як фантомы. Прымружу вочы, пазабаўляюся мігценьнем плямаў аўтамабільных фараў. А вось набліжаецца адмысловая пляма — вялікая і белая. Гэта трамвайчык, што павязе мяне дахаты. Калі пашанцуе і ён ня едзе ў дэпо.

Зьміцер Лапцёнак, Менск

Калі Лукашэнка разарве…

Шалёна радуюся з гэнай заварушкі з газам. Можа, у ППРБ скончыцца нарэшце плятанічнае каханьне з «братняю дзяржаваю». Халява скончылася. Прычым і нам, і ім. Як бы мы цяпер ні зласьлівілі, ні лічылі стратаў, ні ўводзілі аплаты за транзыт — Расея будзе пераманьваць нас да сябе. Бо ЭЭ забярэ нас з рукамі і нагамі. А раптам бацька пакрыўдзіцца на Пуціна канчаткова ды дасьць разварoту на 180 градусаў?..

Цяпер і недалёкаму чалавеку стала зразумела, хто нам брат, а хто сволач. Адрубаць газ у такі мароз... Напраўду — пара па рынкавых цэнах. Бо тая падачка-зьніжка ад Расеі надта ўжо дорага нам усім абыходзіцца. Агідна і тое, што розныя... едуць да сванідзаў паліваць брудам Лукашэнку. Яны паліваюць брудам не яго,

а Беларусь. Ды перад кім?! І так усе нас гнюсяць, а калі яшчэ і самі на сябе брахаць будзем… Які б ні быў — але наш.

Калі Лукашэнка разарве ўсе дамовы пра саюз з Расеяй — я першы пайду сьпяваць песьні ў ягоны гонар. Гэта будзе мой Лукашэнка. Астатняе дацісьнем.

Раман Тумашык, Менск

Тунэльны эфэкт у палітыцы

У атамнай фізыцы існуе такая зьява, як тунэльны эфэкт. Сутнасьць: магчыма нават немагчымае. Тунэльны эфэкт можа быць і ў палітыцы, што паказалі падзеі ў Грузіі. Грузія, якая не зьяўляецца суседкай Эўразьвязу, народ, які цяжка назваць гістарычна эўрапейскім, раптоўна сталі бліжэй да Эўропы, чым мы, беларусы-ліцьвіны.

Сёньня ўсе мы павінны паверыць у пэсымізм Васіля Быкава: у Нацыі часу не засталося. Актуальны толькі адзін лёзунг: «Хто ня з намі — той супраць Беларусі». Цмока можа перамагчы толькі адзін рыцар — які мае на гербе «5+».

Стаць часткамі яго цела, яго зброі, дадаць сваю сілу да яго сілы — абавязак кожнага беларуса. Посьпех залежыць ад таго, што пераможа — беспадстаўны масавы страх (але ж людзей не забіваюць і ў гулагі не высылаюць), амбіцыі лідэраў ці розум, салідарнасьць і адказнасьць за будучыню Нацыі.

Тунэльны эфэкт магчымы, але спачатку трэба збудаваць гэты «тунэль» — цяжкай штодзённай працай. Трэба забыцца на страх, трэба штодзённа тлумачыць сябе і іншым, што, аб'яднаныя, мы абавязкова пераможам. Спачатку — перамога. Потым будзем вышукваць «блох» у саюзьнікаў.

Разам мы — сіла, паасобку — пясок.

Вітаўт Невядомы, yahoo.com

УДАКЛАДНЕНЬНІ

З Талачына

У «НН» №1 ад 9 студзеня ў матэрыяле «Юбілеі 2004» было пазначана, што 4 лютага адзначаецца 75-гадовы юбілей Лявона Баразны. Між тым Л.Баразна нарадзіўся ў 1928 г. і юбілей быў летась. Памылка ў «НН» прывандравала з календара «Родны край». Але імя Баразны вартае таго, каб згадваць яго штогод. Гэты мастак не баяўся пярэчыць Машэраву, адстойваючы беларускасьць, і быў забіты ў Менску ў 70-я. На 20-ю гадавіну сьмерці на яго магіле ў Талачыне паставілі помнік працы Валяр'яна Янушкевіча. У Менску складаецца зборнік успамінаў пра Лявона Баразну, у Амэрыцы рыхтуецца да выданьня альбом яго этнаграфічных замалёвак.

Алесь Давыдчык, Талачын

Ад Купавы

У «НН» № 20'2003 была зьмешчаная інфармацыя В.Болбаса пра выставу Міколы Купавы ў сьветлагорскай галерэі «Традыцыя», дзе, між іншага, пісалася, што на радзіме Купавы, у Воршы, улады не дазволілі мастаку выставіць карціну «Інтэграцыя». Гэтыя зьвесткі не адпавядаюць рэчаіснасьці. Улады ня ўмешваліся ў фармаваньне выставы ў Воршы.

Мікола Купава

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

«Кампутарны» футбаліст

Калісьці нас сабралі з усяго гораду й зрабілі ў адной менскай школе спартовую клясу — гандбольную. І нейкім чынам трапіў да нас хлапец-футбаліст. Мы яго звалі Васілём. Вясёлы, кампанейскі: свой хлапец, сярод нас амаль нічым не вылучаўся. Дарма што займаўся футболам ды з намі не трэніраваўся. Хоць зь цікаўнасьці і езьдзіў, здаралася, паглядзець, «як вы кідаеце мячык». Далей гаворка пойдзе не пра нашу спэц-спартклясу, а пра гэтага хлопца — Васіля.

З маленства ён займаўся ўлюбёным відам спорту ў сваім родным Бабруйску, дзе жыў з бацькамі. Стаў прыкметна вылучацца сярод аднагодкаў ды падаваць пэўныя надзеі. Яго заўважылі менскія «сэлекцыянэры» ды прапанавалі пераехаць у Менск, каб займацца футболам на больш прафэсійным узроўні. Так Вася апынуўся ў нас. Мы прынялі яго па-сяброўску, як свайго. На той час ён ужо лічыўся самым пэрспэктыўным юным футбалістам краіны.

Спачатку Васіль глядзеў на нас ледзь не з замілаваньнем, зь нейкім дзяцяча-юнацкім захапленьнем, якое бывае толькі ў правінцыйных маладых хлопцаў, што трапляюць у «вялікае жыцьцё». Мы здаваліся яму ледзь не да краю «прафэсійнымі», у якіх усё — і жыцьцё, і спаборніцтвы, і ўзровень падрыхтоўкі — знаходзіцца на належным узроўні. Хутка тое самае зьявілася і ў яго.

І ўсё б у гэтай гісторыі было добра, калі б не адна акалічнасьць. Бацькі Васіля засталіся ў Бабруйску, а хлопец жыў у Менску ў сваіх бабулі зь дзядулем. І калі мы на тыдзень і больш зьяжджалі кудынебудзь за мяжу на спаборніцтвы, вучоба спынялася. Васіль заставаўся зь незнаёмым горадам сам-насам, без належнага нагляду. Што хлопцу было рабіць аднаму? Хутка зьявіліся сябры, зь якімі ў нас супольных інтарэсаў не было.

Яшчэ адным фактам не на карысьць нашай школьнай адміністрацыі было тое, што яна дазволіла зрабіць у памяшканьні, дзе праходзіла працоўнае навучаньне (у нас гэта быў асобны будынак), вялікі кампутарны клюб. І большасьць падлеткаў, нягледзячы на ўсе «аблавы», сядзела не за школьнымі партамі, а за кампутарнымі сталамі.

Тады й для Васіля вялікі кампутарны клюб быў сапраўдным дзівам. Дарэчы, акрамя футболу, Васіль выявіў неблагія здольнасьці і да кампутарных гульняў. Спачатку ён наведваў гэтае месца, толькі калі мы былі на спаборніцтвах. А потым стаў «прападаць» там і замест урокаў, і замест трэніровак. Яго не заяўлялі на гульні, усё часьцей садзілі на лаву запасных. Але кампутарная ліхаманка зацягвала хлопца.

Хутка Васіль перайшоў у паралельную клясу. Казаў, што надакучылі нашыя бясконцыя паездкі, якія «ламаюць яму ўвесь графік». Пасьля 9-й клясы Васіль застаўся на другі год. А неўзабаве і зусім зьнік, мы ня ведалі, што зь ім і дзе ён. Адно ведалі дакладна: з футболам Васіль скончыў…

У 11-й клясе перад намі стала непазьбежнае пытаньне — куды паступаць, — і кожны стаў пакрысе аддаляцца, больш займацца сваімі прыватнымі справамі, рыхтавацца. Нядаўна, вяртаючыся на пачатку 23-е з падрыхтоўчых курсаў, я зьнясілеў настолькі, што ня меў моцы глядзець навокал. Хтосьці пацягнуў за рукаў… «Вася — гады ў рады!» Часу было няшмат: мне заставаўся адзін прыпынак, і Васіль толькі пасьпеў паведаміць, што вяртаецца дамоў з кампутарнага клюбу на Трактарным заводзе…

З мутарным адчуваньнем я чыкільгаў дадому: было бязьмерна шкада, што колішні блізкі сябар так і ня ўзяўся за розум. Праз некалькі дзён мне пашанцавала яшчэ раз — у тым самым месцы я сустрэў Васю зноў. Часу было больш. Васіль распавёў, што вучыцца ў вячэрняй школе, асаблівых дасягненьняў у навуцы ня мае. На маё запытаньне, навошта езьдзіць гуляць у кампутар так далёка, адказвае: «Клюб там рэальны!» Вельмі ганарыцца тым, што іх каманда зь пяці чалавек найлепшая па кампутарных гульнях у Беларусі. Хваліцца: «Нядаўна на Чэмпіянаце СНД хахлы перамаглі — мы занялі другое месца. Расейцы ў …» Ганарарам былі паўтары тысячы даляраў, якія яны адразу прапілі. Скардзіцца, што крыху баліць пячонка…

Пытаюся: а што далей? — паціскае плячыма: «Дарма, напэўна, закінуў футбол. Шанцы неблагія былі…» Пра гэта яму казалі ўсе: і трэнеры, і бацькі, і мы. Дый ён і сам добра ведаў, а цяпер: «Хрэнь нейкая — на Чэмпіянаце Беларусі добра калі 50 даляраў дадуць… У той жа вечар іх і няма!…»

…Цягніка мэтро не было 10 хвілін, і, трымаючы ў галаве нядаўнія падзеі ў Маскве, я бязьвінна спытаўся: «Ды што ў іх там, дзе ён падзеўся?» І запытальна паглядзеў сябру ў твар — ці ведае ён пра жудасныя падзеі ў сталіцы суседняе дзяржавы. А ён, здагадаўшыся, узрушана загаварыў: «А, дык мы ж павінны былі ехаць у тым вагоне!» Далей чуецца адказ на маё нямое запытаньне: «Мы былі на чарговым першынстве, месцам збору выбралі станцыю мэтро. Адзін чэпуш спазьняўся на 15 хвілін. Ты б ведаў, як мы яго лаялі. І тут нам аб'яўляюць, што нешта здарылася зь цягнікам, які на нашых вачах адышоў з станцыі. Пачалося чортведама што… Спазьніліся на гульні на пяць гадзінаў — ішлі пешкі па Маскве, што кішма кішэла мянтамі. Затое якія былі ўдзячныя таму валіку, што так доўга мыўся ў душы…»

Разьвітваючыся, мы ўжо пасьміхаліся адзін аднаму й казалі: «Да сустрэчы ў мэтро…» Вось так, напэўна, мы і сустрэнемся ў наступны раз: я — пасьля школы, дзьвюх трэніровак ды курсаў па матэматыцы й ангельскай, а ён — пасьля чарговай «страляніны» ў кампутарным клюбе на Трактарным.

Алесь Квіткевіч, Менск



Артур Калінаў, рэдактар «pARTisan»-у

ЖЫЛІБЫ ЧЫТАЧА

Фінікі й тапінамбуры

«pARTisan» — апалёгія чыстага сафізму

Хто такі *партызан*? Гэта пазасыстэмны герой. Маем. Перад намі яшчэ адна зь бясконцага колазвароту вэрсіяў найноўшай беларускай культуры. Праз год пасьля выпуску Асацыяцыяй сучаснага мастацтва першага нумару першага беларускага часопісу па актуальных праблемах актуальнага мастацтва, выйшаў нумар другі. Часопіс «Мастацтва» займеў інтэлектуальную альтэрнатыву.

Гэтым разам чытачам/гледачам/спажыўцам прапануецца нізка развагаў пра ўзаемадатычнасьць Культуры й Дэмакратыі. У якасьці сьведкаў і судзьдзяў прыцягнутыя Артур Клінаў, камісар pARTisan'скага руху, сусьветна вядомы мастак Лявон Тарасэвіч, добра знаны ў літоўскіх дыяспарах амэрыканскі прафэсар Томас Венцлава, поп-інтэлектуал Максім Жбанкоў, левы радыкал Лёлік Ушкін ды рэдактар зь Вільні Сяргей Дубавец.

Пасыл, дадзены для развагаў Артурам Клінавым сваім суаўтарам: панаваньне Дэмакратыі прыводзіць да ссоўваньня Культуры на пэрыфэрыю грамадзкіх запатрабаваньняў. Правакацыйны зьмест такога пасланьня відавочны. Што, зрэшты, і адпавядае канцэпцыі часопісу. Але тутака ж тоіцца й небясьпека павярхоўнасьці.

Томас Венцлава, якому задавалі пытаньні Барысевіч з Клінавым, зрабіў хітра. Ён палічыў за лепшае пагадзіцца са сваімі суразмоўцамі, пахваліўшы іх за цікавыя пытаньні. Што праўда, ён уплішчыў у дыскусію трэці тэрмін — Цывілізацыю, супрацьставіўшы ёй Культуру. А вось Лявон Тарасэвіч, з тымі ж самымі суразмоўцамі, абраў паблажліва-настаўніцкі тон: «Дарагі Артур, Культура — гэта ўсё, што зрабіў чалавек, узяў ад продкаў ці суседзяў». Сьвежа й арыгінальна. Сяргей Дубавец, задаючыся пытаньнем, ці пагражае нам заняпад культуры, адказвае, што гэта немагчыма. Аднак роля мастака або літаратара ў будучым бачыцца яму «з характарыстыкамі тапінамбураў або фінікаў»... З гэтых матэрыялаў складаецца першая, тэарэтычна-дыскусійная частка часопісу. Атрымалася чытанка-салата фантазійнага кірунку з водарам экзатычных плядоў і нотаю сьвежае саломы Артура Клінава.

Але калі мэтаю выдаўцоў і аўтараў насамрэч ёсьць дывэрсія, а «партызан — гэта той, хто выяўляецца ў момант дывэрсіі» (В. Акудовіч), то ўсё сышлося. Нечаканы прадукт, багата аздоблены мастацкімі фота, адметна зьвярстаны, насычаны мноствам супярэчлівых думак, што пярэчаць адна адной. Як тапінамбуры й фінікі. Прынамсі, у карыстальніка Культураю ёсьць выбар. А гэта ўжо Дэмакратыя.

Сяргей Харэўскі

Доўгачаканы №2 часопісу «pARTisan» можна будзе патрымаць у руках і набыць на прэзэнтацыі выданьня ў пятніцу а 18-й у Купалаўскай бібліятэцы.

Электронная энцыкляпэдыя

Інтэрнэт папоўніўся беларускай «Электроннай энцыкляпэдыяй» (www.slounik.org). Стварылі яго энтузіясты зь «Беларускай палічкі». На сайце зьмешчаныя слоўнікі ды энцыкляпэдыі, якія выйшлі з пачатку 90-х ды існуюць пераважна ў выглядзе кніг. Агулам у 10 энцыкляпэдыях на сайце 2176 артыкулаў, а ў 13 слоўніках — 87368.

Інтэлігенцыя пратэстуе

На тыдні зьявіліся два адкрытыя лісты, падпісаныя прадстаўнікамі творчае інтэлігенцыі. Беларускія пісьменьнікі накіравалі пісьмо міністру інфармацыі, пратэстуючы супраць хуткага закрыцьця часопісу «Бярозка». Сярод падпісантаў Уладзімер Арлоў, Генадзь Бураўкін, Андрэй Федарэнка і інш. Другі ліст распаўсюдзілі акторы фальклёр-тэатру «Госьціца», зачыненага кіраўніцтвам тэлебачаньня. У абарону дзіцячага калектыву свае подпісы паставілі Ніл Гілевіч, Алег Трусаў, Сьвятлана Зелянкоўская і інш.

Кірмаш мёду

Да **29 лютага** ў Палацы мастацтваў (Казлова, 3) будзе праходзіць Кірмаш мёду. На ім можна будзе набыць насеньне кветак-меданосаў, мэдычныя прэпараты для пчолаў і, вядома, пакаштаваць «сам прадукт». Цікаўных ды ласуноў чакаюць з 10 да 19-й.

Творы Дабужынскага

Нацыянальны мастацкі музэй да 13 сакавіка запрашае на выставу «Творы Мсьціслава Дабужынскага». Гэты творца ў пачатку 1920-х узначальваў Віцебскую мастацкую вучэльню. Што праўда, такім рэвалюцыянэрам, як яго сучасьнікі Шагал, Малевіч ці Пэн, ён ня быў. Пасьля, жывучы ў Коўне, Дабужынскі браў удзел у распрацоўцы грошай і сымболікі маладое літоўскае дзяржавы. Грошай і сьцяга на выставе няма. Затое ёсьць віцебскія краявіды 20-х.

Новыя дакумэнтальныя стужкі

Новыя стужкі беларускіх дакумэнталістаў можна ўмоўна аб'яднаць тэмаю «вывучэньне чалавека». У «Помніку» Юр'я Гарулёва распавядаецца пра лесьніка Аляксея Балюка, які, нечакана адужаўшы ад сьмяротнае хваробы, ставіць помнік на месцы баёў часоў першай сусьветнай. «Душа мая зь імем жаночым. Эліза Ажэшка» Міхаіла Якжына — пра жыцьцёвы выбар, што рабіўся насуперак тагачасным грамадзкім настановам. «500 гадоў памяці» Рышарда Ясінскага — пра тое, як зьмяняецца чалавек, адкрываючы для сябе гісторыю роду: як краязнавец Анатоль Бацюшка дасьледаваў сваю радаслоўную. Тры гэтыя карціны прэзэнтавала 20 лютага студыя дакумэнтальных фільмаў «Летапіс». У сакавіку студыя рыхтуе прэзэнтацыю працаў Віктара Асьлюка, Міхаіла Жданоўскага і Галіны Адамовіч.

Новая кніга Акуліна

Больш за чатыры сотні чалавек сабраліся на прэзэнтацыю новае кнігі Эдуарда Акуліна «Непрычалены човен». Заля Дому літаратара не зьмяшчала ўсіх ахвотных.

«ЛіМ» мае сайт

У газэты «Літаратура і мастацтва» зьявіўся сайт www.lim.by. Ён адначасова будзе выконваць функцыю электроннага рэсурсу аднайменнага холдынгу. Віншуем калегаў!

Кампазытары для мабільнікаў

22 лютага ва Ўроцлаве пачаўся XXIV Фэстываль сучаснай польскай музыкі «Musica Polonica Nova». Апрача выкананьня ўласна сымфанічнай музыкі, арганізатары замовілі 19 кампазытарам напісаць 20-сэкундавыя мэлёдыі для мабільных тэлефонаў: «Фэстываль званкоў» асьвятляецца ў Інтэрнэце на сайце фэсту (www.MusicaPolonicaNova.pl).

Загінуў Руш, памёр Аверынцаў

У Нігеры ў аўтакатастрофе загінуў французкі рэжысэр-дакумэнталіст Жан Руш. 86-гадовы Руш браў удзел у тамтэйшым кінафэстывалі. У 50-х ён заснаваў новую хвалю ў дакумэнталістыцы, якую назваў «кінапраўда»: вялікія часткі фільму здымаліся без рэжысэрскага сцэнару. Самым вядомым фільмам Руша стала «Хроніка аднаго лета». У Афрыцы ён зьняў вядомыя стужкі «Ягуар», «Паляўнічыя на львоў». У 1987—1991 узначальваў французкую Сынэматэку.

У Вене ў суботу на 67-м годзе жыцьця адышоў расейскі культуролаг Сяргей Аверынцаў. Згодна з запаветам, ягонае цела будзе крэмавана, а попел пахаваны ў Маскве.

Лелюш пра парыжанаў

Вядомы рэжысэр Клёд Лелюш скончыў здымкі авантурнай камэдыі пра каханьне «Парыжане». Гэта 39-я стужка рэжысэра, які стаў славутым пасьля фільму «Мужчына і жанчына» (два «Оскары» і «Залатая пальмавая галіна» Канскага фэстывалю). «Парыжане» маюць распачаць трылёгію «Род чалавечы», куды ўвойдуць таксама фільмы «Тэатральны бульвар» і «Рыкашэты». Агулам праект мусіць скончыцца пры канцы 2005 г.

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

Вытворчая драма з жыцьця спэцназу

«S.W.A.T.: Спэцназ гораду анёлаў»

З рэклямнага роліку перад намі паўстае дынамічны баявік, поўны дзеяньня і напружаньня. У самім жа фільме, як ні дзіўна, аднаго і другога небагата: гэта хутчэй вытворчая драма з жыцьця спэцназу. Не абыходзіцца без Сэмюэля Л.Джэксана, процістаяньня колішніх сяброў, нечаканай здрады ды фінальных «разборак» у мэтро і на чыгунцы. Млявыя пралёг і экспазыцыя займаюць амаль палову хронамэтражу. Такое ўражаньне, што мантажоры ленаваліся працаваць нажніцамі, хоць на самай справе гэта задума рэжысэра Кларка Джонсана. Ён такім чынам хацеў сказаць сваё «фэ» стваральнікам сучасных блякбастэраў, дзе гледачу, маўляў, не даецца ні хвіліны адпачынку. Прымаць задуму з удзячнасьцю ці адпрэчваць — справа густу, але ролікі да фільмаў варта ўсё ж рабіць больш адэкватнымі.

Іван Пятроў

Рок-школа

28—29 лютага ў Наваполацку пройдзе «Рок-кола» — найдаўнейшы штогадовы фэст, што праводзіцца ў Беларусі. «Рок-кола» закруцілася ў траўні 1990-га. Усе вядомыя рок-музыкі краіны хоць раз ды бралі ў ім удзел. «Бацька» фэсту Сяргей «Аніса» Анішчанка называе лічбу 200. Столькі каманд сыграла тут за чатырнаццаць гадоў. Менавіта з дапамогай «Рок-кола» сталіся вядомыя такія гурты, як «Мясцовы час» ці «The Stokes».

Зазвычай фэст ладзіўся ўлетку. Чаму перанесьлі на люты? Так пажадалі спонсары канцэрту, гаворыць Аніса. Дый бясьпечней: слухачы не палезуць купацца ў Дзьвіну, выпіўшы піва.

28 лютага ў Полацкім палацы культуры пройдзе конкурсная праграма. Маладыя гурты будуць граць з 14-й да 17-й і з 19-й да 22-й. За гэты час мусяць выступіць 30 камандаў, пераважна з Полацку і Наваполацку («Бела Росы, «Фляўс і Кляйн», «Вэрсія» і інш.). Чакаецца прыезд гомельскае «Бан Жвірбы», якая зрабіла фурор на «Басовішчы'2001». Кошт квітка на ўвесь дзень — 4000 руб.

29 лютага а 20-й у наваполацкім клюбе «Night City» адбудзецца гала-канцэрт ляўрэатаў фэсту і гасьцей: легендарнага «Мясцовага часу», «J-Морс», «The Stokes» і інш. Кошт квітка — 10 тыс. руб.

Зь Менску на «Рок-кола» найзручней дабірацца цягнікам «Менск—Полацак» (адыходзіць у 23.50, прыбывае ў 8.40). Месца ў купэйным вагоне каштуе 17 тыс., у пляцкарце — 12 тыс. рублёў.

Сяргей Будкін

Сяргей Міхалок:

Мне трасянка смачная

Працяг са старонкі 8.

«НН»: Самы экстрэмальны ўчынак Вашага жыцьця?

С.М.: Я лічу, што людзі, якія шукаюць экстрыму па-за жыцьцём… ну, можа, ім занадта добра жывецца? Для мяне ўсё жыцьцё — экстрэмальнае задавальненьне. Калі мне кажуць, што толькі на роліках можна атрымаць сапраўдны адрэналінавы выбух, я ім раю пад'ехаць на роліках да кінатэатру «Дружба» дзесьці ў Чыжоўцы. Вось там будзе экстрым. Я зьдзяйсьняў учынкі на грані фолу, гэта зьвязана з п'янствам або юным нігілізмам, але ня буду распавядаць. Не люблю распавядаць пра сябе ўсё. Ня хочацца ператвараць інтэрвію ў флюараграфічны здымак.

«НН»: Вы кажаце, што не жадаеце мець ані сталае кватэры, ані машыны. Запабягаеце прывязкі да чагосьці?

С.М.: Гэта мне пакуль ня трэба. Хоць я маю грошы на ня самую горшую кватэру і машыну і не саромеюся ў тым прызнацца. Гэта зароблена, а ня выйграна ў лятарэю. Я жыву ў здымных кватэрах і мяняю іх. Гэта ня вельмі ўтульна, але мяне задавальняе. Хоць побыту я не баюся і вырашаю гэтую праблему на хаду. Іду ў краму «Зрабі сам» і латаю гаспадарку.

«НН»: Фотамастачка Ксенія Нікольская з Санкт-Пецярбургу ня ведае, хто такі калдыр. Мы ня здолелі растлумачыць, хоць усім нутром разумеем, хто гэта. Дайце дэфініцыю. Тым больш што ўзьнікла цэлая парадыгма — калдырыцца, закалдыраны, калдырны й г.д.

С.М: «Калдыра» выдумаў Лёша Хацкевіч, Хацон, мой сябар. Дарэчы, «Саша й Сірожа» — таксама вельмі раскручаны брэнд. Мы з Хацонам даўно працуем. Спачатку быў гурт «Мэталёвы буралом», потым такі сьмешны з назваю «Блакітныя пеўні», а потым тэатар «Бамбукі». Тады і ўзьнік панятак «калдыр». Ня блытайце калдыра з гапатой і ўркамі ды з голенымі пацанамі з Шабаноў. Калдыр жыве ў кожным чалавеку, незалежна ад сацыяльнага стану. Ня вычысьціў зубоў ранкам — гэта калдыр у табе аджыў. Пайшоў у трэнікаў у краму — калдыр. Хочаш котцы нагою нападдаць, але стрымліваешся — перамог у сабе калдыра. Чорнае альтэр-эга чалавека — калдыр. Забі калдыра ў сабе й г.д. Такая ідэя. Мы цяпер яе раскручваем у сэрыі тэлепраграмаў, на ўкраінскай тэлевізіі пойдуць неўзабаве. На Беларускай тэлевізіі мы працаваць болей ня будзем. Ня будзем калдырыцца.

«НН»: Вас называюць лідэрам крэольскага мастацтва ў краіне. Вы бачыце ў крэольстве будучыню нашай нацыі?

С.М.: Гэта ня тэма маёй дысэртацыі — куды Беларусь паверне. Я ня надта добра ведаю гісторыю й геапалітычныя рэаліі, бо прыехаў сюды ў 18 год, калі ўжо цалкам склаўся. Я — сын вайскоўца, нарадзіўся ў Нямеччыне і добра папаезьдзіў, пакуль трапіў у Менск.

На пачатку свайго шляху мы сьпявалі па-беларуску. Я слухаю, як Лявон Вольскі ці наш гукаржысэр Саша бліскуча гавораць на мове. Але зь цяжкасьцю даю рады зь беларускай. Ва ўнівэрсытэце культуры, які я скончыў, выкладчыкі ставаліся ўбіць яе мне ў галаву, і ў мяне было пачуцьцё пратэсту, як супраць любога інтэлектуальнага гвалту. Я выхоўваўся на расейскай клясыцы зь невялікімі адхіленьнямі ў бок абэрыутаў, Платонава й г.д. Скажу шчыра, шмат што зь беларускай літаратуры мне так тады й не закаціла. Напрыклад, гумару Цёткі я абсалютна не разумею. Я ня быў краныты і Максімам Багдановічам. Калі мае беларускамоўныя выкладчыкі ў нашых ідэйных спрэчках ставілі Багдановіча побач з Забалоцкім або Вэрленам, мяне гэта падтрэсвала. Брэнд «Багдановіч» быў мне незнаёмы. Я проста ня ведаю беларускай мовы ў такой ступені, каб іранізаваць. Па-расейску я валодаю поўнай знакавай сыстэмай. Калі я сьпяваю «сады-стады» і «калье-аліўе», усе разумеюць, пра што вядзецца.

> Калі мне кажуць, што толькі на роліках можна атрымаць сапраўдны адрэналінавы выбух, я ім раю пад'ехаць на роліках да кінатэатру «Дружба» дзесьці ў Чыжоўцы. Вось там будзе экстрым.

«НН»: А трасянкавай сыстэмай вы, па-мойму, цудоўна валодаеце.

С.М.: Гэта мой фальклёр, мова вуліц. Я ведаю падшэўку жыцьця. Я п'янстваваў, бываў на піўніках, панкаваўся, езьдзіў па мястэчках. На трасянцы нават крымінальнікі гавораць: «Маць, нясі брагу, пасьпела!» Таму мая трасянка смачная, бо эклектыка — самы смачны элемэнт мастацтва. Трасянка — кіч, несур'ёзная мова, мова багемы. На трасянцы гавораць мае сябры — Хацон, паэты, мастакі, тэатралы. Трасянка мне далася лягчэй, чым беларуская. Я ня ўмею іранізаваць па-беларуску.

«НН»: Мой любімы Сяргей Даўлатаў сказаў бліскуча: «Тысячы кніг напісана пра шкоду алькаголю і ніводнае — пра ягоную карысьць. Дарма». І гэта напісаў чалавек з цырозам пячонкі. Перад шоў «Крамбамбулі» належыць гаварыць пра алькаголь...

С.М.: Алькаголь важны для мяне. Я вітаю ўсё, што зьвязана з алькаголем. Мне гэта цікава. У маім жыцьці розныя пэрыяды бываюць. Часам я жадаю піць, а часам мне неабходны цьвярозы погляд на рэчаіснасьць. Цяпер мне ўжо паўгоду няма як піць — няма калі. Для стымуляцыі творчых справаў мне алькаголь не патрэбны. Я не пішу п'яны. Але алькаголь даў мне гаму перажываньняў, станаў, поглядаў на жыцьцё. Я зазнаў рэчы, якіх не спазнаў бы, каб быў цьвярозынікам. Раней вельмі хацелася піць, але грошай не было й ніхто не прастаўляўся. А цяпер грошы ёсьць і кожны другі прагне мне праставіцца, але няма ахвоты піць. Такі парадокс! Каб у маладосьці гэтыя фазы супалі, вось было б добра.

Аднак калі я апынаюся з раніцы ў нейкай «пажыўной мясьціне з п'янымі пэрсанажамі», лічу, што найлепшым і найдарэчнейшым будзе выпіць. Карацей, я ня маю канонаў што да алькаголю.

«НН»: Складаецца ўражаньне, што Вы не жадаеце залежаць ні ад чога — ні ад маёмасьці, ні ад звычак. Гэта слушнае ўражаньне?

С.М.: Так. Гэта, можа, самы каштоўны набытак майго жыцьця, я моцна ганаруся гэтым. Ёсьць шмат апокрыфаў пра «Ляпіс Трубяцкой». Сотні людзей у горадзе распавядуць вам, як яны зь Міхалком сядзелі ў турме, у дурдоме, пілі й трэскаліся разам. Чысты гарадзкі фальклёр. Мы неаддзельныя ад жыцьця, ад вялікай тусьні. Мы ператварыліся ў пэўнае творчае аб'яднаньне. «Бамбукі», «Ляпіс Трубяцкой», «Саша й Сірожа», славуты клюб «Адыс-Абэба» з пэрформансамі, з панк-буфанадай — напэўна, гэта мая творчая ўдача. Бо ў творчасьці я гавару найперш пра працалюбнасьць, цярпеньне і ўдачу, чым пра талент і геніяльнасьць. Працалюбнасьць і ўдача — гэта рэчы, якія я выпрабаваў.

«НН»: І яны працуюць?

С.М.: Безумоўна.

Гутарыла Сьвятлана Курс

АФІША

Купалаўскі тэатар

28 лютага (суб.) «Кім» паводле А.Дударава.

1 сакавіка (пн.) «Дзіўная місіс Сэвідж» Дж.Патрыка.

3 сакавіка (ср.) «Каханьне ў стылі барока» Я.Стэльмах

4, 5 сакавіка (чцв., пятн.) «Чорная панна Нясьвіжу». А.Дударава.

Балет

26 лютага (чцв.) «Макбэт» В.Кузьняцова і «Балеро» М.Равэля.

28 лютага (суб., раніца) — «Беласьнежка і сем гномаў» Б.Паўлоўскага.

28 лютага (суб., вечар) — «Дон Кіхот» Л.Мінкуса.

1, 2 сакавіка (пн., аўт.) — «Эсмэральда» Ц.Пуні.

4 сакавіка (чцв.) — «Карсар» А.Адана, Ц.Пуні, Р.Дрыга, П.Альдэнбурскага.

5 сакавіка (пятн.) — «Спартак» А.Хачатурана.

Опэра

28 лютага (суб.) «Трубадур» Дж.Вэрдзі.

29 лютага (нядз.) «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага.

4 сакавіка (чцв.)«Чыо-Чыо-Сан» Дж.Пучыні.

Заля камэрнай музыкі

27 лютага (пятн.) «Вечна маладая старадаўняя музыка».

28 лютага (суб.) — вечар музыкі Робэрта Шумана.

5 сакавіка (пятн.) Войтак Мрозаў (Польшча) і ансамбль салістаў «Клясык-Авангард» прэзэнтуюць праграму «Танцы сьвету».

Музычны тэатар

27 лютага (пятн.) рок-опэра «Юнона і Авось» А.Рыбнікава.

28 лютага (суб.) вечар аднаактовых балетаў: «Вальпургіева ноч» Ш.Гуно і «Шапэніяна».

29 лютага (нядз.) «Марыца» І.Кальмана.

3 сакавіка (ср.) «Даратэя» Ц.Хрэньнікава.

4 сакавіка (чцв.) «Кажан» І.Штраўса.

Палац культуры прафсаюзаў

27 лютага (пятн.) Сяргей Манукян (Нью-Ёрк — Масква) і ягонае трыё прэзэнтуюць джаз-шоў «Знойны джаз». Цана квітка ад 8.000 да 18.000 руб.

Расейскі тэатар імя Горкага

27 лютага (пятн.) «Спавешчаньне Марыі» П.Клядэля (драматычная містэрыя).

Цэнтральны Дом афіцэраў

5 сакавіка (пятн.) «Сымфонія каханьня». Аляксандар Анісімаў. П.Чайкоўскі, І.Штраўс

1 сакавіка (пн.) Санкт-Пецярбурскі дзяржаўны акадэмічны тэатар імя Ленсавету паказвае «Калігулу». Квіткі каштуюць ад 23.000 рублёў.

Палац Рэспублікі

29 лютага (нядз.) «Сьпявае Брадвэй». Квіткі каштуюць ад 40.000 да 90.000.

Канцэртная заля «Менск»

6 сакавіка (суб.) «Камэрата», «Чысты голас» прэзэнтуюць праграму «Усе зоркі для каханай»

КІНААФІША

Рэтраспэктыўны паказ фільмаў Жана-Люка Гадара ў **«Перамозе»**:

26 лютага а 19-й — «Карабінэры», **1 сакавіка** «Звар'яцелы П'еро», **2 сакавіка** «Альфавіль» і **3-га** — «ЖЛГ/ЖЛГ»

«Аўрора» (253-33-60)

«Лара Крофт: калыска жыцьця» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.). 16.30, 18.40, 20.50.

«Дзюплекс» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 13.00 (іл).

«Зьнесеныя прывідамі» (д) — **27—29 лютага** (пятн., суб., нядз.) 14.20.

«Берасьце» (272-87-91)

«Мішэль Вальян: Прага хуткасьці» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 14.30, 19.00.

«Рэальнае каханьне» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 16.30, 21.00.

«Дзеці шпіёнаў-3D: Канец гульні» — **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 12.50 (іл).

Мультзборнік (д) — **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 11.30.

«Камсамолец» (245-41-94)

«Развод» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 17.00, 19.00, 21.00.

«Падвойны фарсаж» — **27, 28 лютага** (пятн., суб.) 14.00, 16.00, 18.00, 20.00; **29 лютага** (нядз.) 14.00 (іл).

«Два таварышы» (д) — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 15.00.

«Полі» (д) — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 12.00.

«Кастрычнік» (232-93-25)

«S.W.A.T.: Спэцназ гораду анёлаў» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 18.40, 21.00; **27 лютага** (пятн.) 16.30.

«У пошуках Нэма» (д) — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 14.30; **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 16.30.

«Кіеў» (237-32-70)

«Бляндынка ў законе-2» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 18.00, 19.50.

«Кактэбэль» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз..) 16.00.

«Сьцюарт-Літл-2» (д) — **27, 28 лютага** (пятн., суб.) 14.00.

«Прыгоды піратаў у краіне агародніны» (д) — **29 лютага** (нядз.) 14.00.

«Мір» (284-37-71)

«Чумавая пятніца» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 17.00, 19.00, 21.00; **28 лютага** (суб.) 15.20; **29 лютага** (нядз.) 15.20 (іл).

«Другі бок ложка» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 16.00, 18.10, 20.20.

«Агент Кодзі Бэнкс» (д) — **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 13.00.

«Кніга джунгляў-2» (д) — **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 14.00.

«Масква» (223-14-48)

«S.W.A.T.: Спэцназ гораду анёлаў» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 16.40, 18.50, 21.00; **28 лютага** (суб.) 14.30; **29 лютага** (нядз.) 14.30 (іл).

«Партызан» (266-35-26)

«Валадар Пярсьцёнкаў: Вяртаньне Караля» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 20.00; **27 лютага** (пятн.) 16.40 (іл); **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 13.20, 16.40.

«Перамога» (223-77-66)

«Летуценьнікі» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 21.00.

«Забіць Біла. Фільм 1-ы» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 19.00.

«Анёлы Чарлі-2: Толькі наперад» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 16.50; **27 лютага** (пятн.) 14.40; **28—29 лютага** (суб.—нядз.) 14.40 (іл).

«Піянер» (227-89-45)

«Вельмі страшнае кіно-3» — **27 лютага** (пятн.) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 16.00, 17.40, 19.20, 21.00.

«Кукушка» — **27 лютага** (пятн.) 13.00; **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 14.00.

«Гонар маю» — **27 лютага** (пятн.) 11.00.

«Нязнайка на Месяцы» (д) — **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 12.00.

Мультзборнік — **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 10.30.

«Ракета» (226-06-20)

«Амэрыканскі пірог-3: Вясельле» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 19.50; **28, 29 лютага** (суб, нядз.) 16.30.

«Сонечны ўдар» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 18.10; **27** (пятн.) 14.00.

«Ліла і Стыч» (д) — **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 14.30; **29 лютага** (нядз.) 13.00

«Салют» (226-06-20)

«Валадар Пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 19.30; **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 16.00 (іл).

«Пітэр Пэн у Нідзерландыі» — **27 лютага** (пятн.) 14.00; **28—29 лютага** (суб.—нядз.) 13.00; **28 лютага** (суб.) 11.00.

«Цэнтральны» (220-34-16)

«Кепскія хлопцы-2» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 18.00; **27 лютага** (пятн.) 13.00 **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 13.00 (іл)

«Мішэль Вальян: Прага хуткасьці» — **27—29 лютага** (пятн.—нядз.) 11.00, 15.50, 21.00.

«Электрон» (278-95-63)

«Бумэр» — **27 лютага** (пятн.) 14.00.

«Таксі-3» — **27, 29 лютага** (пятн, нядз.) 18.00.

«Няверная» — **27 , 29 лютага** (пятн., нядз.) 20.00; **28 лютага** (суб.) 21.00.

«Пад небам блакітным…» — **27 лютага** (пятн.) 14.30.

«Ледзяная ўнучка» (д) — **27 лютага** (пятн.) 10.00, 12.00.

«Навагодні паштальён» (д) — **28, 29 лютага** (суб., нядз.) 12.00, 16.00; **29 лютага** (нядз.) — 14.00.

ДЗІЦЯЧЫЯ ІМПРЭЗЫ

Надыход вясны можна адсьвяткаваць зь дзеткамі, зваздзіўшы іх **28 і 29 лютага** ў Купалаўскі тэатар на ранішні спэктакль «Афрыка» Л.Пранчака і У.Кандрусевіча. Прыгоды няўрымсьлівага ката і яго сяброў прыйдуцца вам даспадобы. Таксама **28 лютага** з раніцы Музычны тэатар запрашае на дзіцячы мюзыкл «Бураціна.by». **26 лютага** (чацьвер) зранку можна пайсьці зь дзецьмі ў Опэру на спэктакль «Чыпаліна». **27 лютага ў** Тэатры імя Горкага даюць спэктакль паводле Дж.Радары «Джэльсаміна ў краіне хлусаў». Аматараў кіно **27 і 28 лютага** чакаюць у «Кіеве». Пакажуць працяг прыгодаў белага мышаняці «Маленькі Сьцюарт-2». **29 лютага** тамсама — «Прыгоды піратаў у краіне гародніны». **28, 29 лютага** ў «Міры» — «Кніга джунгляў-2». У «Салюце» 27—29 лютага дэманструюць фільм «Пітэр Пэн у Нідзерландыі».

Сяргей Паўлоўскі

Апошні зь філярэтаў

Леташняя ліквідацыя ўладамі Гуманітарнага ліцэю — апошні ў доўгім шэрагу падобных выпадкаў зь беларускай гісторыі, калі высакароднаму памкненьню моладзі да асьветы і маралі супрацьстаіць чынавенскі гвалт. А самы першы выпадак з гэтага шэрагу адбыўся амаль два стагодзьдзі таму, калі расейская адміністрацыя разагнала студэнцкія таварыствы філяматаў і філярэтаў у Віленскім унівэрсытэце.

Што можна сказаць пра дзяржаву, у якой таварыствы аматараў навукі і прыхільнікаў маральнасьці дзейнічаюць у глыбокім падпольлі? Толькі тое, што адміністрацыя гэтай краіны ўхваляе невуцтва і адмаўляе ролю высакародных памкненьняў. Народ мусіць быць цёмны, слова начальніка — найвышэйшы закон. Філяматы пайшлі на катаргу, а ліцэісты — у падпольле за адно й тое злачынства: высакароднае памкненьне яны лічылі важнейшым за вокрык начальніка.

Выходзіць, нічога не зьмянілася ў Беларусі за мінулыя 200 гадоў, якія складаюцца ў ланцуг аднатыпных фактаў: высакароднае памкненьне да навукі і маралі нараджаецца, трапляе ў падпольле і забіваецца з асаблівым цынізмам. Нараджэньне — падпольле — гвалт.

Як спыніць гэтую зьнішчальную зададзенасьць? Напэўна, трэба, як мінімум, ранейшыя выпадкі разглядаць як урокі гісторыі. А для гэтага іх трэба ведаць.

Антон Адынец, аўтар гімну філярэтаў, прыйшоў у падпольнае таварыства тады, калі яно ўжо было пад сьледзтвам. Дарэчы, і гімн свой ён напісаў у турме. Дакладней, як бы цяпер сказалі, у сьледчым ізалятары.

«Ён пражыў вялікае жыцьцё, 80 гадоў. І змог стаць легендай, — гаворыць дасьледчык Адам Мальдзіс. — Быць сябрам Міцкевіча, пісаць зь ім разам верш, падарожнічаць разам зь ім і жыць. І жыць амаль не рэпрэсаваным. Ну як гэта ўдалося?»

«Успаміны, якія ён пазней напісаў, у якіх ён хацеў асьвятліць сябе ў промнях славы Адама Міцкевіча, гэта слабасьць чалавечая, — кажа іншы адмысловец тае эпохі Ўладзімер Мархель. — Ён сёе-тое прыдумаў. І да сёньняшняга дня мы некаторыя рэчы ўзнаўляем у біяграфіі Міцкевіча недакладна. Калі Адынец апублікаваў безь яго ведама адзін верш, Міцкевіч абурыўся: «Ты б у мяне спытаў. Бо гэты верш узнаўляўся па памяці, і шмат чаго недакладна». А Міцкевічаў рукапіс не захаваўся, і таму на сёньняшні дзень цяжка сказаць, што менавіта.

Калі ў Пушкіна спыталі, чаму ён ня хоча ехаць за мяжу, той адказаў — няма патрэбы. Бо краявіды я магу ўявіць лепшыя, чым убачу там. А замежнікаў мне, пасьля таго, як я пазнаёміўся з Адамам Міцкевічам, ня трэба ведаць. Бо больш вялікага замежнага чалавека няма. Гэта Адынец піша ў лісьце да Міцкевіча. А ці так гэта?.. Ягоныя фантазіі наклалі пэўны адбітак на біяграфію Міцкевіча. А іншых сьведчаньняў няма.

Яны разам падарожнічалі. Сустрэліся ў Саксоніі, Дрэздэн. У Гётэ разам былі. Пасьля Італія, Швайцарыя. Праўда, у Францыі ўжо Адынец быў безь Міцкевіча. Ён усюды адчуваў сябе нароўні. Сустракаўся з Гюго, з многімі клясыкамі нямецкай літаратуры, італьянскай, швайцарскай. Паехаў у Англію, і там сустракаўся з многімі. Ён адчуваў сябе ў Эўропе як рыба ў вадзе. Ён адчуваў сябе эўрапейцам у Эўропе».

У гісторыю літаратуры Адынец найперш увайшоў сваімі ўспамінамі «Лісты з падарожжа», гаворыць Адам Мальдзіс. Гэта чатыры кнігі. Там было апісана падарожжа зь Міцкевічам. Падарожжа рэальнае, але авеянае рамантычным флёрам. Ня ўсе разумелі, як Міцкевічу ўдалося з Санкт-Пецярбургу ды раптам уцячы ў Заходнюю Эўропу. Гэта таямніца да нашага часу.

«Лісты…» выклікалі неадназначную рэакцыю. Дасьледчыкі папракалі Адынца за недакладнасьці. Біяграфічныя, фактаграфічныя. Але гэта ж не дакумэнтальны твор. Гэта падробка пад папулярны ў часы рамантызму эпісталярны жанр. Ён стварэў настрой, перадаваў атмасфэру таго часу. А вось у кнізе «Ўспаміны пра мінулае» Адынец ужо быў дакладны. Пераважна апісваў свае дзіцячыя гады, школьныя. А вучыўся ён у Барунах Ашмянскага павету, дзе ў свой час была Базыльянская калегія. Там вучыліся, апроч Адынца, Юльян Корсак, таленавіты паэт, перакладчык і таксама філямат, Ігнат Ходзька, папулярны празаік.

Сярод усіх філяматаў і філярэтаў Адынец вылучаўся веданьнем моваў і талентам перакладчыка. Ён перакладаў зь нямецкай Шылера, вельмі многа перакладаў з ангельскай літаратуры, найперш Байрана, Вальтэра Скота. З францускай перакладаў. З расейскай — Пушкіна. Амаль усіх рамантыкаў, як заходнеэўрапейскіх, так і расейскіх, ён прысвоіў польскаму чытачу, а праз гэта і чытачам Беларусі, кажа А.Мальдзіс.

Але да працэсу, у якім фармавалася беларуская літаратура, Адам Міцкевіч мае большае дачыненьне, лічыць У.Мархель. Адынец выпадае з гэтага працэсу. Міцкевіч стаў рамантыкам на аснове беларускага фальклёру, а Адынец яго ніяк не выкарыстоўваў. Ён лічыў, што фальклёр — гэта нешта больш нізкага ўзроўню. Па сутнасьці, выказваў погляды клясыцыстаў. Ён нават Чачота папракаў за выкарыстаньне фальклёру. А Чачот убачыў у гэтым глыбіню. Зашыфраванасьць, кодавасьць. Тое самае ўбачыў Міцкевіч. І Міцкевіч стаў вялікім паэтам, а Адынец ня стаў.

Калі ў 84-м годзе з Чылі прыехаў Ігнат Дамейка, яны разам з Адынцом, як нацыянальныя героі, прыехалі на Наваградчыну, у Крашыне пасадзілі два дубкі. Той самы Адынец напісаў эпітафію на магілу Яну Чачоту. Яна ў Ротніцы каля Друскенік. Адынец перажыў сваё пакаленьне і стаў для наступных пакаленьняў жывой легендай. Ужо тое, што ён меў шчасьце падарожнічаць зь Міцкевічам, што жонкай Адынца стала дзяўчына, зь якой Міцкевіч, як прызнаваўся сам, сьпісваў Зосю ў «Пану Тадэвушу», — ужо адно гэта рабіла зь яго вельмі прывабную асобу. Знакавую асобу. Як сымбаль патрыятызму. Бо пасьля разгрому паўстаньня 1863-га настала разгубленасьць. Памерла эпоха рамантызму, але патрэбны былі новыя сымбалі, новыя арыенціры, заўважае А.Мальдзіс.

200-гадовы юбілей філярэта, паэта і мэмуарыста Антона Эдварда Адынца прамінуў 25 студзеня. Ён ня быў уключаны ў юбілейныя пляны ЮНЭСКА. Яго не заўважылі ў Польшчы, хоць энцыкляпэдычная дэфініцыя Адынца — польскі паэт. Не заўважылі і ў Літве, якая цяпер стала мэтрапольнай уладальніцай спадчыны Віленскага ўнівэрсытэту, у тым ліку гісторыі філяматаў і філярэтаў. Адынец, як і большасьць ягоных сяброў з падпольля, аказаўся незапатрабаваны тымі культурамі, якімі ён «прысвоены». І нічога дзіўнага тут няма. Гэты чалавек стаў знакам той Бацькаўшчыны, якую называем Бацькаўшчынай мы, беларусы. Гэта толькі куламеса вонкавых і фармальных адзнакаў — назваў, моваў, межаў — крыху блытае нас у нашым зь ім яднаньні. Што да самога высакароднага памкненьня, дык яно засталося нязьменным.

Кастусь Цьвірка ў прадмове да кнігі «Філяматы і філярэты», якая выйшла ў 1998 г. у сэрыі «Беларускі кнігазбор», тлумачыць той недарэчны бар'ер паміж намі наступным чынам: «…Перашкодай сталася тут польская мова, на якой вымушаны былі пісаць свае творы літаратары Беларусі. У выніку шматвяковай палянізацыі Беларусі ўсё справаводзтва і пісьменства было тут к XIX ст. цалкам польскае. І каб нешта сказаць грамадзтву, каб зрабіць на яго нейкае ўзьдзеяньне, трэба было пісаць толькі папольску... Да пераходу пісьменства і справаводзтва на беларускую мову трэба было яшчэ рыхтаваць грамадзтва. А якраз гэта яны і рабілі. ...Беларускі патрыятызм філяматаў і філярэтаў — вось тая галоўная асаблівасьць іх літаратурнай творчасьці, якая дазваляе гаварыць пра іх як пра самую першую хвалю пачынальнікаў беларускага нацыянальнага адраджэньня».

Непасрэдным пачынальнікам гэтага адраджэньня ў нас называюць Францішка Багушэвіча. Але нездарма ж Багушэвіч рабіў насьледаваньне гімну філярэтаў Антона Адынца і паказаў такім чынам на крыніцу свайго ўласнага станаўленьня.

Дарэчы, у згаданай прадмове да кнігі «Філяматы і філярэты» Кастусь Цьвірка абяцае ў сэрыі «Беларускі кнігазбор» выдаць творы Адынца асобным томам. Таму варта зазіраць на паліцы кнігарняў, дзе ўжо зьявіліся кнігі аўтараў філямацкага кола — Яна Чачота, Адама Міцкевіча і Ігната Дамейкі. Іх трэба чытаць ня толькі таму, што гэта ўсё — пра наш край, і ня толькі таму, што зь іх бярэ пачатак сучасная беларуская ідэя. Галоўным чынам іх трэба чытаць, каб адшукаць у іх нявывучаныя ўрокі гісторыі, каб разарваць тое замкнёнае кола, калі высакароднае памкненьне ў Беларусі нязьменна рушыць адным фатальным шляхам праз нараджэньне, падпольле і гвалт.

Адведзіны Найдзюка

Ёсьць такі горад Вільня. Вільні надзвычай пашанцавала. Яна была сталіцай, найвялікшым горадам ва ўсім нашым краі на ўсходзе Эўропы. У Вільні жылі беларусы, палякі, жыды, літоўцы. І яшчэ многа якія народы. Тут нацыянальныя культуры разьвіваліся, раскрываліся ва ўсёй сваёй красе, перапляталіся зь іншымі, убачыўшы адна адну. У гэтым пераканаецца кожны, хто наведае наш горад і даверліва адкрые яму сваё сэрца.

Ёсьць такі горад Вільня. Вільні страшэнна не пашанцавала. У XX ст. войны ды таталітарныя рэжымы да непазнавальнасьці зьмянілі аблічча гораду і нават склад насельнікаў. Кожная новая палітычная ўлада жорстка распраўлялася з супернікамі. А ўлада ў Вільні за стагодзьдзе ня меней як дзесяць разоў пераходзіла з рук у рукі. Хтосьці сам уцякаў-ратаваўся. Кагосьці гвалтам вывезьлі на захад ці на ўсход. Многіх забілі проста на месцы.

Красамоўнай ілюстрацыяй гэткай зьявы ёсьць лёс віленскіх беларусаў. Вось толькі адзін прыватны прыклад. Жылі ў Вільні тры добрыя сябрукі — Язэп Найдзюк, Янка Багдановіч і Альфонс Шутовіч. Разам рабілі яны ў беларускай друкарні, разам закладалі моладзевую арганізацыю, разам выдавалі часопіс «Шлях моладзі». Жылі ў адным пакоі, дзялілі кожны кавалак хлеба. Як абзаваліся сем'ямі, дзецьмі — сталі кумамі, хрысьцілі дзяцей адзін у аднаго. Карацей — жыцьцё было дружнае, маладое, поўнае цікавай працы, можа, ня надта сытнае, але напэўна шчаслівае. Да часу. Пакуль не прыйшлі «саветы*». Альфонс Шутовіч быў арыштаваны і памёр у турме. Янку Багдановіча таксама арыштавалі і засудзілі на 25 гадоў у Сібір. Язэп Найдзюк вымушаны быў хавацца ў Польшчы пад чужым імем — Юзаф Александровіч.

Але ёсьць штось мацнейшае за войны, зьнішчальныя рэжымы. Гэта — культура. Культурныя здабыткі. Культурная традыцыя. Як з маленькага жалуда вырастае магутны дуб, так з кніжачкі, са слова-ўспаміну вырастае народ.

Ад Язэпа Найдзюка нам тут у Вільні засталося няшмат: успаміны сяброў і дзяцей, некалькі кніжак і пару фатаздымкаў у зборах беларускага музэю. Але гэтыя сьціплыя рэчы, як вяршыня айсбэргу, сьведчаць, якая гэта была велічная асоба. І ў гэтым я пераканалася, калі была запрошаная ў Польшчу на ўрачыстасьці, прысьвечаныя 20-м угодкам сьмерці Язэпа Найдзюка.

Апынуўшыся ў Інаўроцлаве, Найдзюк-Александровіч арганізаваў друкарскую справу і сам узначаліў друкарню. Узгадаваў і вывучыў не адно пакаленьне друкароў, якія, дарэчы, і зьявіліся аднымі з ініцыятараў і спонсараў ушанаваньня яго памяці. Як Юзаф Александровіч ён займаўся вялікай краязнаўчай дзейнасьцю на Куяўшчыне, выдаў кнігу «Гісторыя Інаўроцлава і яго ваколіц». Напісаў безьліч артыкулаў на краязнаўчыя тэмы. І ніхто з тамтэйшых жыхароў, акрамя службаў бясьпекі, якія пры «дапамозе» свайго супрацоўніка ў 1962 г. раскрылі асобу Язэпа Найдзюка, не здагадваўся аб ранейшым жыцьці свайго куміра. Калі ў 90-я ў мясцовай газэце зьявіўся першы артыкул «Кім быў насамрэч Юзаф Александровіч», гэта сталася сэнсацыяй для гораду. Быў доўгі час спрэчак, сумненьняў і разважаньняў над асобай Найдзюка-Александровіча, але здаровы розум перамог.

14 лютага горад урачыста ўшаноўвае памяць Язэпа Найдзюка. Можна было толькі дзівіцца, як удала прайшла імпрэза. Хоць арганізатарамі былі мясцовыя палякі, але не абышлося без дапамогі вядомай беларускай дзяячкі, гістарыцы Лены Глагоўскай з Гданьску. Яна рупліва, па зярнятку зьбірае беларускую спадчыну, расьцярушаную ў Польшчы.

А 8-й раніцы імша ў касьцёле, пасьля ўрачыстае ўскладаньне кветак да магілы «Ю.Александровіча». Адкрыцьцё мэмарыяльнай шыльды на друкарні, якой кіраваў Язэп Найдзюк, уразіла сваім высокім узроўнем — процьма народу, бел-чырвона-белыя сьцягі, сярод запрошаных — Сакрат Яновіч, Юры Туронак, Мікола Давідзюк, Алег Латышонак, беларусы з Гданьску і Беластоку. З польскага боку быў дэпутат Сойму Ўнук, мэр Інаўроцлава ды іншыя прадстаўнікі гарадзкой улады і мясцовай інтэлігенцыі. Што да шыльды, то яна мне спадабалася густоўнасьцю і польска-беларускім надпісам, выкананым лацінкай. Быў нават стрэл з сапраўднай старажытнай гарматы. Пасьля экскурсія па друкарні, адкрыцьцё архіўнай выставы, навуковая канфэрэнцыя, выступы мясцовага піяніста Вітальда Кавальца ды менскага барда Зьмітра Бартосіка. А яшчэ была прэзэнтацыя кнігі ўспамінаў аб Ю.Александровічу мясцовых калегаў. І скончылася ўсё банкетам.

Некалі ж прыйдзе час, і ўшанаваньне беларускага дзеяча — Язэпа Найдзюка — адбудзецца і на яго Радзіме: у Ваўкавыску і Вільні.

Людвіка Вітушкава-Кардзіс

З запазухі

Рыгор Барадулін

Працяг. Пачатак у «НН» № 19—46 за 2003.

Заклікі

Мяне маладога й часьцяком п'янаватага цягнула на рыфмаваныя заклікі. Бо жылі мы ўсе ў часе суцэльных закліканьняў у адным кірунку — да сьветлай будучыні.

Над акенцам, куды здаюць аналізы, прапаноўваў я невядома каму такі заклік:

Браточкі хворыя, сюдой
Здавайце першы свой надой.

У выдавецтве нашыя дзяўчаткі й маладзічкі забягалі пасмаліць і ў так званыя сенцы мужчынскага туалету, бо рамантавалі па чарзе то жаночы, то мужчынскі. І зноў жа зарыфмаваў я лагоднае:

Мілыя паненкі, лэдзі!
Не курыце ў туалеце.
Лепш займіце,
Будзьце любы,
Нечым іншым вашы губы!

Пры перакладзе часта падводзіць аднолькавае гучаньне разнасэнсавых словаў. Была расейскамоўная рэкляма:

Тот, кто утром кофе пьет,
Целый день не устает.

Яе пераклалі:

Той, хто ўраньні каву п'е,
Цэлы дзень не ўстае.

Адразу ўзьнікала пытаньне, ад чаго: ад хваробы ці ад ляноты?

А варта было перакласьці хоць бы так:

Вып'еш зранку шклянку кавы —
Будзеш цэлы дзень рухавы!

Калі пачалі ў Саюз пісьменьнікаў прымаць цэлымі табунамі, вырваўся заклік караценькі:

Аюсь, аюсь,
Усе ў Саюзь!

Калі ў постімпэрскім абсягу запанаваў даляр, зарыфмаваўся заклік з адценьнем карыснай парады:

Як маеце даляр вы,
Ідзіце зь ім да лярвы.

Цяпер проста раіць і ўжываць гэтае клятае камуністамі слова. А ў савецкія часіны, маючы некалькі даляраў у кішэні, ільга было зайсьці за браму (не неўміручасьці) турмы адпаведна на некалькі гадоў. І зусім як эпізод з таннай мэлядрамы ўспамінаецца прыгода афіцыйнага камэдыянта Андрэя Макаёнка. Прыехаў, здаецца, з Амэрыкі. Засталося колькі там даляраў. Вечарам зайшоўся ў ятку ў гатэлі «Менск» і за даляр купіў пляшку каньяку. Удзень выклікалі ў ЦК і па-бацькоўску паўшчувалі: савецкі чалавек павінен купляць за савецкія рублі.

Час — заказчык заклікаў.

Урбаністычны матыў

У Менску другой паловы пяцідзясятых гадоў на Сталінскім праспэкце самымі вартымі ўвагі былі будынак КДБ і грамадзкі туалет амаль насупраць гэтага будынку.

Каля канцылярыі Кадэбэрыі нельга было затрымлівацца ні на хвіліну. Неяк студэнты, якія прыехалі да нас вучыцца з ГДР, заглядзеліся на зашпіленую на ўсе гузікі ўстанову ды яшчэ колькі словаў прамовілі па-нямецку. Адразу ж былі гасьцінна запрошаны ў маўклівы дом, пакуль выясьнялі, што яны не шпіёны. Можа, гэдэраўскія студэнты адчулі будаўнічы почырк землякоў, бо гэтую будыніну й яшчэ колькі іншых у Менску пасьля вайны будавалі палонныя арміі вэрмахту.

Хадзіла й такая рызыкоўная загадка: які будынак у Менску самы высокі? Адказ быў просты — будынак КДБ, бо зь яго Сібір відаць. Яно й за пытаньне, і за адказ можна было атрымаць доўгую й далёкую камандзіроўку.

Туалет пад кавярняй «Вясна» быў як бы пачаткам сталічнай падземкі. У туалеце, бывала, і расьпівалі гарэлку й чарніла. Казалі й так: пойдзем у аталье. Паміж туалетам і гастраномам, які звалі між сабой «Пад гадзіньнікам», быў сквэрык. На галаве Жалезнага Фэлікса любілі сядзець і галубы, і вераб'і, адпаведна абседжваючы яе. У сквэрыку пад прыглядам будынку й непасрэдна таго, з каго Маякоўскі раіў юнакам рабіць жыцьцё, зьбіраліся яўрэі абмеркаваць свой клопат пра зыход у зямлю абжытую (гэта адбывалася ўжо ў сямідзясятыя гады). Падвыпітыя зубашчэры любілі падысьці да купкі яўрэяў і сказаць: я ня ведаю, пра што вы гаворыце, але ехаць трэба...

І адзін зь першых урбаністычных вершаў склаўся ў мяне пра неабходную ўсім установу, нават з установы, што насупраць. Вядома, пачынацца верш мусіў выклічнікам:

Ой, было дажджлівым лета,
Шмат ліло вады.
Я цябе ля туалету
Напаткаў тады.
Стала сьветлаю эпоха
(Што граху таіць).
Чорная твая панчоха
Уваччу стаіць.
Помню, позірк твой ласкавы
Зоркай пыхнуў, згас.
Ты сьпяшалася па справах —
Клікаў унітаз.
Хоць прайшло другое лета,
Сэрца точыць мыш.
Шмат у Менску туалетаў.
Дзе ж цяпер сядзіш?

Як мне здавалася, верш знайшоў водгук у сэрцах шмат якіх маіх чытачоў і нават чытачак. Дакладней сказаць, слухачоў і слухачак.

Застаецца...

Узровень прапагандысцкай, з дазволу сказаць, паэзіі аднолькавы пры ўсіх рэжымах.

Гэта перад блякадай на Вушачу скідаліся зь нямецкіх самалётаў улёткі:

Пячыце ляпёшкі,
Чакайце бамбёжкі,
Падымайце хвасты,
Уцякайце ў кусты.

Ці яшчэ скідаліся такія:

Бяры ў рукі хварасьціну,
Гані жыда ў Палясьціну.

А чым вылучнейшыя прасавецкія лёзунгі:

И на вражьей земле
Мы врага разобьем
Малой кровью могучим ударом.

А на справе крыві хапіла цераз край, і, як казалі людзі, размах быў рублёвы, а ўдар х...вы.

Весялейшую лёзунгавую папеўку ўспамінала мама. Яе сьпявалі польскія жаўнеры напярэдадні цуду над Віслай:

Ешчэ Польска не згінэла,
Наша вудка не скваснэла.
Багнэт на бронь,
Большэвік — агонь!

Землякі мае вострыя на язык былі заўсягды. І показка ў нас была: хоць гол, ды войсьцер. Сьпявалася афіцыйна ўра-папеўка:

Камсамолачка Дарота,
Пойдзем разам ваяваць.
Буду біць я з кулямёта,
А ты — кулі падаваць.

Вушацкія толькі адно слова замянілі, і атрымалася запамінальна:

А ты — кулі пераймаць.

Для беларускага вуха ў слове «прапаганда» ў першую чаргу чуецца «гандаль», застаецца толькі разабрацца ў адценьнях: чым, для каго, за што.

Будучая карова

Вушацкая аўтастанцыя. На сьцяне аб'ява: «Прадаецца будучая карова, падцёлка. Цяліцца будзе ў студзені месяцы».

А пасажырская гурма ні мычыць, ні целіцца.

Самавітыя рэцэпты

Вушацкія былі й добрымі лекарамі, асабліва багатую фантазію мелі на рэцэпты.

Жывот схапіла? Лячыць проста: жывот аб жывот пацерці й ня будзіць балець да самай сьмерці.

За сэрца хапаешся? На сэрца — г...на зь перцам!

Галава баліць — с..цы будзіць лягчэй. Ці радыкальны сродак ад болю: галаву адкруціць і с..ку заторкнуць.

Рэкамэндацыя

Раней па радыё перадавалі ўрокі зарадкі. Дыктар пачынаў:

— Рукі ўгору!

Вушацкія, лічачы ўсё гэта балмаччу, бо руху хапала і ў хляве, і ў гародзе, і каля печы, і ў ложку, дадавалі:

— ...С...ку ўніз,
Каб радзіўся камуніст.

А ў школе дзеці вучылі на памяць: «Камуністы — гэта слова як са сталі...» Дык як жа нарадзіць сталёвага? Тут ужо рэкамэндацыяў дасьціпнікі не давалі.

Мера жалю

— Ці плакала ты па мужыку?

— А як жа! Адно вядро наплакала, другое падставіла.

Жаласьлівае жончына сэрца, што й казаць.

Цёпла будзіць...

Прывёз Марушцы нейкія пашлапні на зіму. Разглядае дый мяркуе:

— Гэта й на сьмерць абуць — там цёпла будзіць хадзіць.

Сялянскі клопат зямны й па незямным жыцьці.

Каб знала...

Марушка разглядае сваё фота:

— Я ж не такая й моршчаная. Каб знала, дык разгладзіла б маршчыны.

Жанчына, пакуль жыве, ня верыць сваім гадам.

Дакладнасьць

Тлумачыла Марушка, куды зьехаў суседзкі сын:

— Ён там, дзе Сібір і мора, дзе халодна дужа.

Генэтычная памяць пра ссылкі й катаргу.

А неяк, калі я прыехаў з-за акіяну, захацелася Марушцы ўдакладніць:

— Ці там, у Амэрыцы, неба й сонца такое, як у нас, ці другое?

Савецкая прапаганда дзятлавала, што ў Амэрыцы ўсё ня так. Быў нават анэкдот: пры капіталізьме чалавек эксплюатуе чалавека, а пры сацыялізьме ўсё наадварот...

Гэта ж, здаецца, пісаў паэт з Магілёва Матэвушаў:

Пасецца калгасны статак
Каля блакітнай ракі.
А там, у Злучаных Штатах,
Рэжуць кароў мясьнікі.

Практычна

— Добры дзень.

— Добры, толькі сена касіць.

Праца на ўсё глядзіць практычна. Таму й зазначыць іншы раз: пагода цёмная, як у мяшку...

Роўнасьць

— Усе жывуць роўна, на два абеды ніхто не пасьпяваіць, — казала некалі Марушка.

Тады не было так званых прэзэнтацыяў. Цяпер і на тры абеды пасьпяваюць няўседныя.

Досьвед

Чаму кот пацука ня возьміць, а кошка возьміць? Калі кот яго хватаіць, а пацук ката за яі. А ў кошкі няма за што хватаць.

Калі пацуку падсмаліць яі, дык мышы будуць уцякаць. (Які ж спрыт трэба мець, каб падсмаліць!)

Калі кату вусы падсмаліць — мышы будуць чуць яго.

Занятак

Пра старога рыбака Марушка казала:

— На рыбу йдзець і з рыбы йдзець — алі ўсё ж на возіры быў...

Прычына

Бабы качоргі мянялі — то барышы пілі. Ня проста п'янка без прычыны.

Пачало даходзіць...

У маленстве не разумеў я, чаго дзядзькі неяк таямніча ўсьміхаліся, кажучы нямогламу: «Жыць будзеш, толькі не захочаш». Цьмяна даходзіла адно значэньне — не захочаш жыць, бо стаміўся ад жыцьця, бо жыцьцё знадакучыла. І толькі з гадамі начало даходзіць другое значэньне выразу, самае сумнае для мужчыны. Усё лепей даходзіць, як да ручкі дойдзеш...

Працяг будзе.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Рыгору Барадуліну ў аўторак споўнілася 69 гадоў. Рэдакцыя далучаецца да віншаваньняў.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Вялікі Пост

Вернікі распачалі Вялікі Пост. Гэтая перадвелікодная традыцыя бярэ пачатак у часах апостальскіх. Яна была ўведзеная на ўзор таго, як сам Ісус пасьля хрышчэньня ў Ярдане 40 дзён маліўся ў пустэльні. Падчас посту сьвятары зьмяняюць шаты на цёмныя, у храмах радзей звоняць у званы, а людзі ўнікаюць мяснога, а часам і малочнага, ды ўсякага сытнага. Сёлета і праваслаўны Вялікдзень, і каталіцкі прыпадаюць на 11 красавіка. Апошні раз такое супадзеньне здаралася ў 2001 г.

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

29 лютага запрашаем на экскурсію **«Гістарычны Пінск».**
Праграма туру:
Пінск: капліца XVII ст.; Варварынская царква; палац Бутрымовіча; касьцёл Карла Барамея; манастыр францішканцаў; касьцёл Ушэсьця XVIII ст.; жылая забудова, касьцёл Божай Маці, манастыр езуітаў; сядзіба, драўляная царква XIX ст.; музэі гораду;
Косава: палац; сядзіба Касьцюшкаў;
Парэчча: парк Скірмунтаў.
Кошт — 18 000 р. для дзяцей і 21 000 р. для дарослых. Тэлефануйце: 8-029-755-03-70, 222-88-61, 222-88-76 (ф).

Запрашаем на падарожжа **29** лютага (нядзеля) па маршруце: Менск — Лаздуны — Трабы — Сурвілішкі — Жамыслявы (палац Умястоўскіх) — Геранёны (замак, касьцёл) — Тракелі — Гародна — Беняконі — Гайцюнішкі (дом-крэпасьць) — Менск.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
Т.: 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

ВІТАНЬНІ

Віншую Ўладзімера Арлова з ужо блізкай вясною. Шчасьця. W.

Эдуарду Акуліну шчыры дзякуй за ўзьнёслую вечарыну. W.

Шыманскую Настасьсю віншую з Днём народзінаў. Кахаю Цябе, мышанятка! Dz.Dzianis

Віншую свайго сябра Паўлюка Мацкевіча з 20-годзьдзем. Мы гэта зробім! Алесь

Віншуем Нядзялкава Ярослава зь перамогай! Ты быў годны яе. Гр98-гіс, Наваполацак

КАНТАКТЫ

Беларуская моладзь з Баранавіч! Давайце знаёміцца! Ствараецца фан-клюб «NRM». Т.: 46-63-68. Руслан

Дык што, няма на Дзятлаўшчыне сьвядомых беларусаў? Алеся, Дзятлаўскі раён, в.Сачыўляны

Славаміру Адамовічу гарачае прывітаньне ад земляка Генадзя С.

У меру ладная і ня ў меру разумная (ці наадварот) дзяўчына да 27 гадоў будзе рада знаёмству з самастойным менчуком. А/с 270, 220050, Менск

Яснавяльможны пан! На Ваш ліст чакае гожая ліцьвінка 26 гадоў. А/с 29, 220088, Менск

Здыму пакой у Гатаве, Мачулішчах, Чыжоўцы або ў раёне Камвольнага камбінату. Т.: 226-42-63. Сяржук

Лошыца-2. Беларуская сям'я з 2-гадовай дачкой шукае аднадумцаў і прыяцеляў у новым мікараёне. Т.: 8-029-772-19-14

Прыстойны малады чалавек, 30 гадоў, бяз шкодных звычак, створыць сям'ю зь сьціплай бескарысьлівай дзяўчынай 18—30 гадоў, без інтымнага мінулага і жыльлёвых праблем. 210015, Віцебск-15, прад'яўніку дакумэнту PI 0003056

Просты хлопец з в/а і бяз шк/зв, добры, зь непрыкметным фізычным недахопам, пазнаёміцца для стварэньня сям'і з простай добрай дзяўчынай да 35 гадоў, можна зь фізычным недахопам. 210027, Віцебск-27, прад'яўніку дакумэнту 4828303

Удава, 65 гадоў, зь мяккім характарам, няпоўная, не патрабуе ад мужчыны нічога, апроч павагі і сумленнасьці ў сямейных адносінах, чакае ліста ад непітушчага мужчыны 65—90 гадоў. 210027, Віцебск-27, прад'яўніцы дакумэнту 1031195

Чарадзей вырашыць службовыя, інтымныя, мэдычныя ды іншыя тупіковыя сытуацыі. Ад Вас — капэрта з адрасам. А/с 22, 222122, в.Лошыца. Барысаўскі раён

КНІГІ

Прадам «Беларускую энцыкляпэдыю», т. 1, 2, «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», т. 1, 2, бібліяграфічны слоўнік «Беларускія пісьменьнікі» ў 6 т. Т.: 283-37-45

ПРАЦА

Рок-гурт шукае бас-гітарыста (узровень не ніжэйшы за сярэдні) з асабістым інструмэнтам і творчым жаданьнем. Т.: 8-029-778-34-22 (Дзіма), 222-72-64 (Каця). belman@tut.by

Шукаю ініцыятыўных, настойлівых, надзейных ды прыстойных асобаў да супрацы ў сур'ёзным бізнэсе. Т.: 8-029-766-12-79. Зьміцер

Шукаю працу ў інтэлігентным асяродку. Т.: 221-21-81. Слава

Сур'ёзная студэнтка шукае працу ці падпрацоўку, 5 курс МІК. Т.: 249-58-70. Алена

Рамонт, наладка, зьбіраньне кампутараў. Т.: 215-04-30, 8-029-615-04-30. Саша

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ____________________

Імя і прозьвішча ____________________

Адрас, тэлефон ____________________

Цень «жалезнага Фэлікса» над «Нашай нівай»

«ІНФА-КУР'ЕР»

Пры канцы мінулага году ўсе калгасы Случчыны па камандзе з аблвыканкаму сталі сельскагаспадарчымі вытворчымі каапэратывамі. Замест старых назваў, у якіх фігуравалі прозьвішчы клясыкаў марксізму-ленінізму, гаспадаркі займелі новыя, «прывязаныя» да найбольшай вёскі ці цэнтральнай сядзібы гаспадаркі. Вось і калгас імя Дзяржынскага стаў называцца СВК «Наша ніва» — так пажадалі праўленцы.

Усё б нічога, але шыльда над уваходам у будынак канторы засталася старая. Чаму не зьмянілі? Адзін з праўленцаў адказаў, што на новую шыльду пакуль грошай нямашака. Ня думаюць там разьвітвацца і з васьмімэтровым гіпсавым помнікам «жалезнаму Фэліксу», што стаіць у доўгім, да самых пятаў, шынэлі і кідае пры захадзе сонца цень на будынак канторы. «Мы яго падрэстаўруем, і няхай стаіць — то наша памяць», — патлумачыў канторскі праўленец. Вось такая памяць аб чалавеку, верныя выхаванцы якога ў 30—40-я рэпрэсавалі тут з высылкай у ГУЛАГ 15 чалавек, залічаных у «кулакі» і «ворагі народу». А васьмёра былі прысуджаныя да расстрэлу.

Варта было б паставіць поруч з гіпсавым балваном хоць мэмарыяльную дошку зь пералікам прозьвішчаў пацярпелых ад сталінскага генацыду. Дык дзе там! У дні «рэвалюцыйных» сьвятаў колішнія калгасныя камуністы і іх аднадумцы, якіх, на жаль, яшчэ нямала ў вёсках (вёсак у калгасе аж сямнаццаць, там жыве за тры з паловай тысячы чалавек) прыносяць да падножжа балвана вянкі і кветкі.

Яшчэ зьдзівілі абыякавасьць і страх мясцовай інтэлігенцыі: настаўнікаў, работнікаў культуры — а такіх набярэцца дзясяткі чатыры. Ніводзін не выпісвае незалежных газэт. Хутчэй не ад беднасьці, а ад страху трапіць пад падазрэньне мясцовай вэртыкалі. Чатыры пэнсіянэры ўсё ж не збаяліся выпісаць «Народную волю». Адзін зь іх, былы калгасны кіроўца, прызнаўся, што аднаявскоўцы глядзяць на яго як на дзівака, а сёй-той і кліча «бэнэфаўцам».

Праўду пісаў неяк Сяргей Дубавец, што «ад работы быць беларусам нас адвучылі за савецкія часы. Тады хто рабіў — той вытыркаўся з натоўпу. Астатнія прыцярпеліся да нацыянальнага нігілізму». Тое самае пераглядваецца і пад засеньню «жалезнага Фэлікса» ў калгасе з такой прывабнай на слых назвай — «Наша ніва».

Міхась Кутнявецкі, Слуцак

United World Colleges

Беларускі камітэт Каледжаў міжнароднай супольнасьці абвяшчае конкурс на атрыманьне дзьвюх бясплатных агульнаадукацыйных стыпэндый у Міжнародных каледжах у Нарвэгіі, Італіі; музычных стыпэндый у Італіі, а таксама 75% стыпэндыі ў Міжнародным сельскагаспадарчым каледжы ў Вэнэсуэле.

У каледжах выкарыстоўваецца сыстэма міжнароднай перадунівэрсытэцкай адукацыі IB (каледж у Вэнэсуэле дае спэцыяльнасьць «мэнэджмэнт у галіне фэрмэрства»). Навучаньне вядзецца на ангельскай мове.

Галоўная мэта Каледжаў міжнароднай супольнасьці — усталяваньне ідэалаў міру, талерантнасьці і супрацоўніцтва паміж моладзьдзю розных краін праз адукацыю. Кожны студэнт каледжу зьяўляецца прадстаўніком сваёй краіны і павінен як мага больш паведаміць пра яе сваім сябрам па вучобе з больш чым 150 іншых краін. Таму, апроч выдатных акадэмічных ведаў, кандыдаты павінны выдатна валодаць беларускай мовай, ведаць гісторыю і культуру Беларусі.

Музычныя стыпэндыі (струнныя інструмэнты: фартэпіяна, скрыпка, віялянчэль, чэла) прызначаюцца для асобаў, якія выявілі выбітныя здольнасьці і маюць дасягненьні ў галіне музыкі.

Узрост абітурыентаў — 16—17 гадоў (16 гадоў павінна споўніцца да 1 верасьня 2004). Узрост абітурыентаў Сельскагаспадарчага каледжу ў Вэнэсуэле — 18—22 гады, пажадана, каб яны былі сялянскага паходжаньня і мелі схільнасьці да сельскагаспадарчай працы.

Конкурс адбываецца ў два туры. На першы тур абітурыенты павінны даслаць да 10 красавіка 2004 г. заяву з сваім адрасам, кантактным тэлефонам і нумарам школы, даведку аб стане здароўя, ліст пасьпяховасьці за мінулы і гэты навучальныя гады, характарыстыку, зьвесткі аб удзеле ў вучнёўскіх алімпіядах, мастацкай самадзейнасьці, спартовых сэкцыях, копіі грамат, дыплёмаў і г.д., а таксама твор на тэму «Ліст зь Беларусі» аб'ёмам не больш за чатыры старонкі вучнёўскага сшытка на беларускай ці ангельскай мовах.

Прэтэндэнты на музычныя стыпэндыі павінны даслаць, акрамя названых матэрыялаў, відэазапіс з выкананьнем не менш як дзьвюх музычных п'есаў агульнай працягласьцю да 10 хвілін, а таксама копіі дыплёмаў музычных конкурсаў.

Пераможцы будуць выкліканыя на другі тур, які адбудзецца 23 красавіка 2004 г.

Дакумэнты дасылаць на адрас: вул.Румянцава, 13, 220050, Менск, з пазнакай «на конкурс «UWC».

«Наша Ніва» дзякуе спадарам
Анатолю Васілеўскаму зь Менску,
Кастусю Акулу з Таронта,
Адольфу Суботу,
Віталю Кажану зь Нью-Ёрку
за падтрымку!

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Усеваладу С. зь Менску. «Містычная гісторыя Беларусі» не інтрыгуе.

Віялеце П., Зьмітру П. з Кастрыцы. Скласьці сетку крыжаванкі — палова справы. Трэба яшчэ прыдумаць цікавыя дэфініцыі. «НН» аддае перавагу фармулёўкам, якія апэлююць ня столькі да ведаў, колькі да лягічнага мысьленьня.

Іне А. зь Вілейкі. Апавяданьне мусіць мець выразны сюжэт, эсэ — утрымліваць завершаныя думкі. А вершы ў Вас вобразныя.

Віктару Ф., Вользе К. Пра дзейнасьць Уладзімера Плешчанкі «НН» паведамляе рэгулярна. Зьяўленьне ў «Хроніцы супраціву» лепшае за любыя камплімэнты.

Міколу К. з Пружанаў. Не ў цыганох тут справа, а ў нас саміх.

Ігару Х. зь Менску. З вашых развагаў пра ідэалёгію вынікае, што ўлада робіць усё, каб перастаць быць уладай. Парадокс.

В.Т. зь Менску. Вы няправільна ставіце пытаньне. Гэтак можна зашкодзіць Ліцэю.

Валер'ю К. зь Мёраў. Дасланыя вамі статыстычныя зьвесткі можна знайсьці й праз іншыя крыніцы інфармацыі. Для публікацыі ў «НН» варта было прааналізаваць статыстыку, параўнаўшы яе зь лічбамі мінулых гадоў, і зрабіць высновы або зьвесьці да аднае-дзьвюх тэндэнцыяў ды праілюстраваць іх прыкладамі з жыцьця.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Арцём Лява
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам A2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3608. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 25.02.2004.
Замова № 1169.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а